Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№176 (28540)

13 ВЕРАСНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12



**Ідучы ў грыбы, апранайцеся ярка**

СТАР. 3



**Дрэваапрацоўка пачала «прачынацца»**

СТАР. 4



**Адраснае субсідаванне і рынак жылля**

МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сёння ў краіне на кожнага беспрацоўнага ўмоўна прыпадае дзве вакансіі, а ў Мінску — амаль чатыры. У апошнія месяцы ў цэлым па рэспубліцы адзначаецца рост колькасці вакансій: так, за жнівень іх стала больш на 1,9 тысячы, за ліпень — на 1 тысячу, за чэрвень — на 4 тысячы, а ў цэлым за мінулы год — у 1,5 раза. Так, на 1 верасня 2016 года свабодных працоўных месцаў у краіне было 37,4 тысячы, а на 1 верасня 2017-га — ужо 56,6 тысячы. Што да сталіцы, то тут на 1 верасня гэтага года на 3,6 тысячы зарэгістраваных беспрацоўных прыпадала больш як 13,5 тысячы вакансій. Магчымасць умоўнага працаўладкавання беспрацоўных на вакансіі ў цэлым па краіне павялічылася больш чым удвая. Дарэчы, жнівень—верасень — месяцы максімальнай занятасці насельніцтва».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9286 | ▲ |
| Еўра | 2,3058 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АД ФІЛАСОФІІ АДНОСІН — ДА КАНКРЭТНЫХ ПРАЕКТАЎ

Вынікам візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Індыю сталі важныя крокі на ўмацаванне і пашырэнне супрацоўніцтва нашых краін у розных сферах

**«Надышоў час, калі мы павінны ўжо размаўляць мовай канкрэтных кантрактаў, а не проста кірункаў развіцця эканомік. Напрамкі мы вызначылі, філасофію нашых адносін мы вызначылі. Цяпер трэба пераходзіць на канкрэтыку, а яна ў кантрактах, інвестыцыях». Гэтыя словы, якія Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сказаў падчас сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам Індыі Венкайахам Найду можна назваць лейтматывам афіцыйнага візіту кіраўніка нашай дзяржавы ў гэтую паўднёваазіяцкую краіну.**

Увогуле праграма візіту беларускага лідара ў Індыю была надзвычай насычаная. Аляксандр Лукашэнка сустрэўся таксама з Прэзідэнтам Рамам Натхам Кавіндам, правёў перагаворы з міністрам замежных спраў Сушмой Сварадж. Афіцыйныя перагаворы з прэм'ер-міністрам Надэндрам Модзі прайшлі ў практычнай плоскасці — на іх абмяркоўвалася развіццё беларуска-індыйскага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, палітычнай, навукова-тэхнічнай і гуманітарнай сферах, турызме.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

Сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Індыі Надэндра Модзі.

# У Волі бульбы ўволю



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары вёскі Воля Пружанскага раёна ў мінулыя выхадныя напружана працавалі на бульбяных палетках.

СТАР. 4

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ЯК СУСТРЭЦЬ УРАГАН?

## У Беларусі наладжана сістэма папярэджання аб пагрозлівых з'явах надвор'я

**Стужкі навін сусветных агенцтваў ужо другі тыдзень поўняцца навінамі з амерыканскага кантынента. На змену ўрагану «Харві» прыйшла не менш страшная «Ірма». І ўзнікае лагічнае пытанне: а наколькі добра працуе сістэма папярэджання аб такіх пагрозлівых з'явах надвор'я? Карэспандэнт «Звязды» шукаў адказ на яго з дапамогай супрацоўнікаў Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Беларусі.**

Адначасова са стварэннем Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі ўзнікла патрэба ў адмысловай рэгулюючай структуры. Меркавалася, што яна арганізавала б узаемадзеянне з усімі дзяржаўнымі органамі нашай краіны, узяла на сябе абавязкі па апавяшчэнні органаў і камісій, а таксама насельніцтва аб пагрозе і ўзнікненні надзвычайнай сітуацыі. Такой структурай і стаў Рэспубліканскі цэнтр кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі.

Ён да 2015 года знаходзіўся ў Мінску на Лагойскім тракце. Два гады таму скончылася будаўніцтва новага комплексу на вуліцы Іерусалімскай. Будынак ужо ўзводзіўся пад сучаснае абсталяванне — тэлекамунікацыйныя сістэмы кіравання і сувязі, якое дазваляе працаваць як з абстаноўкай унутры дзяржавы, так і на міжнародным узроўні ў адпаведнасці з пагадненнямі, якія заключылі ўрады і МНС. Абмен інфармацыяй ідзе штосутачна, пры пагрозе надзвычайнай сітуацыі — неадкладна. Цяпер, сярод іншага, з'явілася магчымасць праводзіць і сеансы відэаканферэнцсувязі для таго, каб прыцягваць экспертаў і ў рэжыме анлайн абмяркоўваць бягучую сітуацыю.

Структура, падобная на беларускі Цэнтр, яшчэ з 1995 года працуе ў Расіі. Яна шмат у чым нагадвае нашу, але мае зусім іншыя маштабы. У нас яна — адна на ўсю краіну, у іх — такіх некалькі з-за куды большай тэрыторыі. Амаль поўнасцю аналагічныя нашаму Цэнтру структуры існуюць у нашых суседзяў — Польшчы, Украіны, Літвы і Латвіі.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# АД ФІЛАСОФІІ АДНОСІН — ДА КАНКРЭТНЫХ ПРАЕКТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па выніках афіцыйных перагавораў з прэм'ер-міністрам Індыі Надэндрам Модзі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь «вельмі зацікаўлена ў тым, каб Індыя стала вялікай, магутнай краінай. Таму, што мы прапаведавалі, абвяшчалі і падтрымліваем дагэтуль ідэю шматпалярнасці. І мы хацелі б, каб Індыя стала магутным полюсам нашай планеты». Пры гэтым беларускі Прэзідэнт падкрэсліў: «Вялікая Індыя немагчымая без вашай прысутнасці на той тэрыторыі, на якой размешчана Беларусь, — паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Еўрасаюзам».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што па міжнародным парадку дня ў бакоў практычна няма ніякіх разыходжанняў. «Мы дамовіліся ўмацоўваць супрацоўніцтва ў рамках нацыянальных арганізацый, актыўна ўзаемадзейнічаць у пошуку эфектыўных і адпаведных інтарэсам усіх дзяржаў рашэнняў глабальных і рэгіянальных праблем сучаснасці», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка запрасіў Нарэндра Модзі наведаць Беларусь у найбліжэйшы час, а напярэдадні вырашана правесці пасяджэнне міжурадавай камісіі, якое стане этапам падрыхтоўкі візіту прэм'ер-міністра Індыі ў Беларусь. «Я гарантую вам, усяму кіраўніцтву Індыі, што ўзятыя на сябе абавязацельствы мы выканаем спаўна», — падкрэсліў беларускі лідар.

Гаворачы аб супрацоўніцтве, кіраўнік дзяржавы запэўніў: «Мы гатовыя даць вам самыя выгадныя і льготныя ўмовы функцыянавання вашага бізнесу ў выпадку інвеставання ў Беларусь. Такі досвед з іншымі краінамі ў нас ёсць». Пра сур'ёзнасць намераў бакоў сведчыць падрыхтоўка дагавора аб інвестыцыях. Аляксандр Лукашэнка таксама паабяцаў усялякую падтрымку ў пытанні хутчэйшага заключэння пагаднення аб свабодным гандлі паміж дзяржавамі — членамі ЕАЭС і Індыяй. Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі прапануе Індыі стварыць у Беларусі навукова-тэхналагічны індустрыяльны парк, «дзе будуць створаны самыя выгадныя ўмовы для інвесціравання і дзе індыйскія кампаніі разам з іншымі сусветнымі кампаніямі, калі будзе такое жаданне, змогуць размяшчаць сваю вытворчасць і рэалізоўваць тавары і паслугі на тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза і Еўрасаюза».

Па выніках візіту дасягнута дамоўленасць па пытаннях павелічэння паставак у Індыю калійных угнаенняў, прымянення беларускіх напрацовак у развіцці ініцыятывы ўрада Індыі «Разумныя гарады», праграмы «Кваліфікаваная Індыя», абмеркаваны сумесныя праекты ў галіне навукі, культуры, турызму і іншых сферах.

Па завяршэнні афіцыйных перагавораў былі падпісаны праграма супрацоўніцтва паміж урадамі дзвюх краін у сферы культуры на 2018—2020 гады, мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам адукацыі Беларусі і Міністэрствам павышэння кваліфікацыі і прадпрымальніцтва Індыі аб супрацоўніцтве ў сферы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам адукацыі Беларусі і Міністэрствам па справах моладзі і спорту Індыі па пытаннях супрацоўніцтва ў сферы маладзёжнай палітыкі.

Заключаны мемарандум паміж Беларускім дзяржаўным канцэрнам па нафце і хіміі і Міністэрствам нафты і прыроднага газу Індыі аб супрацоўніцтве ў нафтагазавым сектары. Заключаны дагавор аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Нацыянальнай акадэміяй навук Індыі, а таксама мемарандум аб узаемаразуменні паміж Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміяй і Індыйскім саветам сельскагаспадарчых даследаванняў (па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і даследаванняў для сельскай гаспадаркі). Пагадненне аб супрацоўніцтве заключана з Мінскім трактарным заводам — зборачную вытворчасць беларускіх трактароў у Індыі плануецца адкрыць ужо ў наступным годзе.

**Паводле БЕЛТА.**

## ■ На слыху

# Каму давераць незалежную ацэнку якасці адукацыі?

**У Агенцтва па кантролі якасці адукацыі плануецца аб'яднаць дзве міністэрскія структуры: Дэпартамент кантролю якасці адукацыі і Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Пра гэта расказаў журналістам міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

Ён адзначыў, што якасць ведаў павінна вызначацца на падставе не толькі правядзення ўнутраных кантрольных мерапрыемстваў, але і ўдзелу ў міжнародных праграмах па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў, такіх як, напрыклад, PISA. У наступным годзе беларускія школьнікі ўпершыню будуць «праэкзаменаваныя» па міжнародных індыкатарах якасці PISA нароўні са школьнікамі больш чым з 70 краін. У прыватнасці, комплексныя тэсты PISA ацэньваюць не акадэмічны аб'ём ведаў, а тое, наколькі 15-гадовыя падлеткі гатовы прымяняць на практыцы атрыманыя ў школе веды. Міністр падкрэсліў, што гэта дазволіць нашай краіне звяраць свае крокі з сусветнай адукацыйнай прасторай.

Варта нагадаць, што падчас нядаўняга Рэспубліканскага педагагічнага савета абмяркоўваліся перспектывы ўвядзення ў Беларусі незалежнай атэстацыі для выпускнікоў базавай школы, а таксама змяненне формы атэстацыі выпускнікоў сярэдняй школы. Гэта будзе задачай Агенцтва па кантролі якасці адукацыі. Разам з тым міністр падкрэсліў, што ўсе пераўтварэнні неабходна праводзіць асцярожна, арыентуючыся на досвед правядзення ўступнай кампаніі ў ВНУ, у прыватнасці, на празрыстую і зразумелую ўсім сістэму ЦТ, якой у нашай краіне ўсе давяраюць.

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт планаванай аптымізацыі ў сферы вышэйшай адукацыі, Ігар Карпенка растлумачыў, што аптымізацыя мае на ўвазе не скарачэнне, а сыход ад дубліравання шэрагу спецыяльнасцяў і закрыццё няпрофільных спецыяльнасцяў у ВНУ.

— У нас сёння хіба што толькі самы лянівы не займаецца падрыхтоўкай юрыстаў і эканамістаў, а павінны быць пэўныя напрацоўкі, дзейнічаць навуковыя школы, якія змогуць забяспечыць якасную падрыхтоўку спецыялістаў, — адзначыў Ігар Карпенка. — Таксама неабходна ўлічваць патрэбы беларускай эканомікі: у першую чаргу трэба разглядаць тыя перспектыўныя спецыяльнасці, якія заўтра будуць запатрабаваныя на рынку працы і дадуць магчымасць спецыялісту з дыпломам уладкавацца і атрымліваць прыстойны заробак.

Па словах міністра, неабходна перагледзець і дубліраванне шэрагу спецыяльнасцяў у сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах.

— Мы павінны ад гэтага адысці. Так, як гэта зроблена ў сістэме аховы здароўя, дзе спецыяліст з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй не дубліруе, а дапаўняе спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, — растлумачыў Ігар Карпенка. — А ў нас, напрыклад, тэхнолагаў рыхтуюць і ў сярэдніх спецыяльных, і ў вышэйшых навучальных установах. Трэба іх функцыі размежаваць, але гэта праблема ўжо не Міністэрства адукацыі, а міжведамасная праблема, якую неабходна вырашаць ва ўзаемадзеянні з міністэрствамі эканомікі, працы і сацыяльнай абароны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Брытанскія дэпутаты прынялі «Біль аб адмене законаў ЕС»

Палата абшчын брытанскага парламента прагаласавала за прыняцце ў другім чытанні законапраекта аб адмене законаў Еўрасаюза, паведамляе агенцтва Reuters. За прыняцце «Біля аб адмене законаў ЕС» прагаласавалі 326 дэпутатаў, супраць выказаліся 290. Вынікі галасавання сталі першай праверкай у рамках працэсу Brexit для ўрада меншасці прэм'ер-міністра Тэрэзы Мэй. «Парламент прыняў гістарычнае рашэнне падтрымаць волю брытанскага народа і прагаласаваў за законапраект, які дасць пэўнасць і яснасць напярэдадні нашага выхаду з ЕС», — сказала прэм'ер.

## Дзярждоўг ЗША ўпершыню перавысіў 20 трыльёнаў долараў

Дзяржаўны доўг ЗША ўпершыню ў гісторыі пераступіў цераз адзнаку ў 20 трыльёнаў долараў, паведамляе Washington Examiner. Як адзначаецца, гэта адбылося пасля падпісання прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам закона аб часовым павышэнні парога дзяржаўнага доўгу краіны. Ён пайшоў на гэты крок на ўмове, што амерыканскія парламентарыі адначасова прымуць пакет федэральнай фінансавай дапамогі пацярпелым ад урагану «Харві».



## Выбаркам Сінгапура ўхваліў адзіную кандыдатуру на пост прэзідэнта

Прэзідэнцкая выбарчая камісія Сінгапура выдала кваліфікацыйнае пасведчанне, якое дазваляе прыняць удзел у выбарах прэзідэнта краіны толькі аднаму кандыдату, адзначаецца ў заяве на афіцыйным сайце ўрада. Імя кандыдата, які адпавядае ўсім патрабаванням выбаркама, у заяве не называецца. Пры гэтым, паводле звестак газеты Straits Times, адзіным кандыдатам стала былы спікер парламента краіны Халіма Якаб. Заяўку для ўдзелу ў выбарах падалі ўсяго пяць чалавек, толькі трое з іх заявілі, што належаць да малайскай супольнасці (прыналежнасць да этнічнай групы з'яўляецца абавязковай умовай).

## Большасць іспанцаў супраць рэферэндуму ў Каталоніі




Больш за 60% іспанцаў выступаюць супраць правядзення рэферэндуму аб незалежнасці Каталоніі. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага кампаніяй Sigma Dos. 60,3% рэспандэнтаў выказаліся супраць дазволу праводзіць рэферэндум. Падтрымалі ініцыятыву 29,1%, яшчэ 10,6% не змаглі адказаць. Большасць удзельнікаў апытання (45,7%) таксама мяркуюць, што рэферэндум, прызначаны на 1 кастрычніка, не адбудзецца. Аднак 35,9% іспанцаў вераць у тое, што каталонцы ўсё ж змогуць прагаласаваць, нягледзячы на заявы Мадрыда. Рэферэндум — не злачынства, аб чым заявіў кіраўнік Жэнералітэта Каталоніі.

## ПРАМАЯ ЛІНІЯ

**У гэтую суботу, 16 верасня, адбудзецца сумесная прамая тэлефонная лінія намесніка старшыні Гарадоцкага райвыканкама Марыны Здольнікавай і рэдакцыі газеты «Звязда».**

Лінія працуе з 9.00 да 12.00 па тэлефоне 8 (02139) 4-18-45.

Усе хвалюючыя вас пытанні і тое, як яны вырашаюцца, знойдуць адлюстраванне на старонках нашага выдання.

Газета «Звязда», як заўсёды, застаецца вашым верным сябрам і карысным дарадчыкам. Практыку правядзення сумесных прамых ліній з кіраўнікамі мясцовай улады мы будзем працягваць і надалей.

## ■ Тры пытанні да ўлады

# АДЗІН ЭТАП УБОРКІ ПРОЙДЗЕНЫ...



**На брэсцкім абласным фестывалі працаўнікоў вёскі Пружанскі раён згадалі як аднаго з лідараў жніва. Па выніках спаборніцтва Пружаншчына заняла другое месца, усяго толькі крышачку саступіўшы Брэсцкаму раёну. Заслужаныя ўзнагароды атрымалі асобныя працаўнікі і гаспадаркі. Пра асаблівасці сёлетняга хлебаробскага года, жніво і ўборку ўраджаю ў цэлым — нашы традыцыйныя «тры пытанні». Мы задалі іх намесніку старшыні Пружанскага райвыканкама, кіраўніку райсельгасхарча Алене ЛАПЫЦЫ.**

***— Алена Харытонаўна, якім запомніўся гэты год аграрыям вашага рэгіёна, што спрыяла і што перашкаджала пры вырошчванні збожжавых, а потым пры іх уборцы?***

— Вясна, калі памятаеце, была гэтым разам надта суровая. У нас у чэрвені замаразкі здараліся да мінус 7. Асобныя пасевы былі страчаныя, мы асцерагаліся рабіць любыя прагнозы на ўраджай. А потым нібы Бог нас пачуў, надвор'е выраўнялася, пайшлі патрэбныя дажджы, колас стаў набіраць сілу. І мы ўжо так чакалі гэтай прыпозненай уборкі, так рыхтаваліся, што ўсё пайшло як па масле. Надвор'е спрыяла, тэхніка амаль не ламалася, людзі працавалі ад цямна да цямна. А калі падводзілі вынікі, дык душа радавалася. Дазволю сабе ўсё ж некалькі лічбаў. Работніку аграрнага сектара, наогул спецыялісту, яны пра многае скажуць. Так, валавы намалот сёлета склаў 133,2 тысячы тон збожжа. З кожнага гектара сельгаспрадпрыемствы раёна сабралі па 43,1 цэнтнера. Нашы лідары атрымалі намнога больш. Напрыклад, гаспадарка «Агра-Калядзічы» мае ўраджайнасць 60,4 цэнтнера з гектара, «Велікасельскае Агра» — 55,2, «Мурава» — 54,6.

***— Якая работа вядзецца на палях цяпер?***

Завершаны толькі першы этап уборкі. Пачынаецца другі працягласцю недзе ў два месяцы. Амаль усе гаспадаркі прыступілі да скошвання кукурузы, на палях збіраюць бульбу, зараз пачнецца масавая ўборка цукровых і кармавых буракоў. Чакае сваёй чаргі лён. Паралельна вядзецца трэці ўкос траў. Кармоў гэтым разам мы нарыхтавалі добры запас. Значыць, будзем з малаком. Работы многа, яна вядзецца не менш інтэнсіўна, чым калі ўбіралі збожжавыя. Так што да перыяду адпачынкаў працаўнікам сельскагаспадарчай галіны яшчэ далёка.

***— А потым можна кіравацца ў санаторыі альбо ў цікавыя паездкі. Думаю, некаторыя могуць дазволіць сабе і замежныя турнэ. Ці праўду пісалі ў інтэрнэце, што падчас жніва камбайнеры зараблялі да 140 рублёў за дзень?***

— Праўду. Былі і такія заробкі. Асабліва ў тых гаспадарках, дзе дасягнутая высокая ўраджайнасць. Усё залежыць ад дзённага намалоту, тыпу машыны, працягласці рабочай змены таго ці іншага работніка. Але нават там, дзе атрымаліся больш сціплыя зарплаты, мы знайшлі магчымасць заахвоціць, падзякаваць механізатарам, кіроўцам грузавікоў, якія правялі ўборачную збожжавых вельмі і вельмі добра. Некаторых з іх, герояў сёлетняга жніва, варта, думаю, назваць. Гэта, напрыклад, экіпажы камбайнераў Аляксандра і Андрэя Слабод ААТ «Велікасельскае Агра» (намалот 1766 тон), Віктара Аліфірука і Мікалая Даўгуна з ААТ «Агра-Калядзічы» (1546 тон). На адвозцы збожжа найлепшы вынік у раёне паказаў кіроўца з ААТ «Ружаны-Агра» Аляксандр Пухнарэвіч, які перавёз 2851 тону. А сярод апаратараў зернесушыльных комплексаў лідзіруе Сяргей Лівянкоў з «Ружаны-Агра».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Гонар сталіцы

# ГОРАД МАЙСТРОЎ

## У Мінску ўзнагародзілі найлепшых у прафесіі

**Сёлета ў конкурсе прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар — 2017» прынялі ўдзел каля 20 тысяч работнікаў сталічных прадпрыемстваў і арганізацый. У гарадскія фіналы прайшоў 741 чалавек, з якіх 38 сталі пераможцамі.**

Урач, кандытар, прадавец, швачка, афіцыянт, інспектар ДПС — пералік прафесій штогод пашыраецца. Расце і колькасць моладзі, якая ўдзельнічае ў спаборніцтве за званне найлепшага спецыяліста. Так, сярод сёлетніх пераможцаў 19 чалавек — ва ўзросце да 31 года.

— Гэты конкурс важны для горада. Мы часта бачым па тэлебачанні славутых людзей, але практычна не ведаем тых, хто сваёй штодзённай працай уносіць уклад у эканоміку сталіцы, развіццё інфраструктуры, выхаванне падрастаючага пакалення. Вялікі дзякуй пераможцам за тое, што робіце горад больш прыгожым, чыстым і ўтульным, — павіншаваў майстроў **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ.**

— Калі мы пачыналі конкурс у 2004 годзе, нават не ўяўлялі, які маштаб ён набудзе. Мы вучым паважаць чалавека працы, павышаем прэстыж найбольш масавых прафесій. Пераможцы спаборніцтваў паднялі аўтарытэт не толькі свой, але і прадпрыемстваў. Не сорамна ўжо называць Мінск горадам майстроў, — лічыць **старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў Мікалай БЕЛАНОЎСКІ**.

За мінулыя гады ў конкурсе прынялі ўдзел больш за 200 тысяч работнікаў, 446 з якіх былі прызнаны найлепшымі ў прафесіі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Факт

# Дэфляцыя дубль два

## У жніўні ўжо другі месяц запар у нашай краіне фіксуецца адмоўная інфляцыя

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў жніўні ў параўнанні з ліпенем склаў 99,2%, паведамляюць у Нацыянальным статыстычным камітэце. Інакш кажучы, за мінулы месяц цэны на тавары і паслугі ўпалі на 0,8%. З пачатку года інфляцыя склала 2,5%.**

Спецыялісты адзначаюць, што памяншэнне цэн назіраецца галоўным чынам на харчовай групе тавараў. Яны ў жніўні патаннелі на 1,9%. А вось нехарчовыя тавары ў мінулым месяцы падаражэлі на 0,3%, паслугі падраслі толькі на 0,04%.

З пачатку года харчовыя тавары падаражэлі на 1,5%, нехарчовыя — на 1,7%, а платныя паслугі — на 5,8%. Нагадаем, што ў ліпені ў Беларусі зафіксавалі дэфляцыю ў 0,1%.

Урад прагназуе, што ў гэтым годзе тавары і платныя паслугі падаражэюць не больш чым на 9%. Пакуль тэмпы росту коштаў на тавары і платныя паслугі ніжэйшыя, чым прагназавалася. Летась кошты на тавары і платныя паслугі ў Беларусі выраслі на 10,6%, а ў 2015 годзе — на 12%.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Беражыце сябе!

# Каб не заблудзіць у лесе

**Цёплае надвор'е, якое прыйшло на змену даждлівым, паспрыяла імклівому росту грыбоў. Але зайшоўшы ў лес па баравікі, выбірацца з яго можна даволі доўга... Толькі ў Віцебскай вобласці за пазамінулыя суткі шукалі ажно шасцярых грыбнікоў.**



— Двое мужчын згубіліся ў лесе каля вёскі Валатоўкі Рассонскага раёна, — паведамілі ў прэс-службе Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС. — А 18-гадовы юнак заблудзіў у Чашніцкім раёне. Трое грыбнікоў самі патэлефанавалі ратавальнікам, калі зразумелі, што выбрацца з гушчару яны не могуць. На шчасце, усе рабінзоны выйшлі з лесу самі, пачуўшы гук сірэн пажарных аўтамабіляў.

Як жа правільна паводзіць сябе ў лесе, пацікавіўся карэспандэнт «Звязды» ў **прадстаўніка Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Настассі ШВАЙБОВІЧ**.

— Абавязкова апраніце што-небудзь яркае, каб вас пры неабходнасці можна было заўважыць з паветра. Перад выхадам у лес уважліва вывучыце карту мясцовасці. Калі вы дрэнна арыентуецеся, лепш не рызыкаваць і папрасіць суправаджаць вас таго, хто добра ведае мясцовыя лясныя масівы. Не забудзьцеся ўзяць з сабой компас і мінімальную аптэчку. Збіраючыся ў лес, звяртайце ўвагу на ўмовы надвор'я — у пахмурныя дні падарожжа ў ягады і грыбы лепш адмяніць. Раскажыце родным і блізкім пра тое, дзе вы будзеце заходзіць у лес, па якім маршруце пойдзеце і калі плануеце вярнуцца. Прыхапіце з сабой тэлефон, ваду, лекі, нож, запалкі, мінімальны запас ежы на той выпадак, калі вы заблудзіце.

А калі выйсці з лесу не атрымліваецца, то самае галоўнае — гэта не паддацца паніцы. У Беларусі няма лясоў, дзе на сотні кіламетраў навокал нельга сустрэць ніякіх прыкмет цывілізацыі. Паклічце на дапамогу: дзесьці побач могуць знаходзіцца леснікі ці грыбнікі, якія дапамогуць зарыентавацца на мясцовасці. Калі вам ніхто не адказаў і ў вас ёсць з сабой тэлефон, пазваніце па нумары 101 ці 112 і паведаміце, дзе вы заходзілі ў лес, куды збіраліся рухацца, і апішыце, што бачыце вакол. Прыслухайцеся — шум трактара чуваць за 3—4 кіламетры, брэх сабакі — за 2—3 кіламетры, таварны цягнік — за 10 кіламетраў. Вашымі правадырамі на вялікую зямлю могуць стаць лініі электраперадачы, прасекі, сцяжынкі. Калі па дарозе сустрэўся ручай, то ідзіце ўніз па яго цячэнні.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Ініцыятыва ад ЖЭСа

# Пасадзі дрэва

**Месячнік па ўборцы, прывязденне ў парадак і азеляненне тэрыторый стартуе ў Мінску з 1 кастрычніка, паведаміла на аператыўнай нарадзе ў мэрыі начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Марына Малаева.**



Менавіта такая працоўная акцыя традыцыйна арганізуецца восенню, каб падрыхтаваць аб'екты гарадской гаспадаркі да зімы. У прыватнасці, неабходна завяршыць рамонт дарог, комплекснае добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый і азеляненне горада. Гарадскія службы разлічваюць на актыўны ўдзел мінчан у мерапрыемствах — кожны жыхар можа далучыцца да пасадкі дрэў і кустоў, навесці парадак у пад'ездзе і двары. Адрасныя планы камунальным службам і адміністрацыям раёнаў неабходна распрацаваць да 25 верасня.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЯК СУСТРЭЦЬ УРАГАН?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асноўная работа Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі праходзіць у зале аператыўнага кіравання. Адразу ж на ўваходзе кідаецца ў вочы велізарны панарамны экран. Тут збіраецца інфармацыя аб здарэннях, якія запатрабавалі ўдзелу ратавальнікаў з усёй краіны. На падставе яе штораніцы рыхтуецца зводка, якая трапляе на сайт МНС.



— Давайце паглядзім, што ў нас на панарамным экране, — кажа **галоўны аператыўны дзяжурны Валерый РОСЛІК.** — Адну яго частку запаўняе інжынер аддзела маніторынгу. Тут выводзіцца інфармацыя з сайтаў надвор'я, якія адсочваюць абстаноўку ва ўсім свеце. Можна, напрыклад, паназіраць за праходжаннем навальнічных франтоў, станам водных аб'ектаў... Адзін з сектараў прысвечаны дарожнай абстаноўцы ў Мінску. Датчыкі паказваюць тэмпературу паветра і пакрыцця. Практычна на ўсіх праблемных участках, дзе ўзнікаюць заторы, устаноўлены відэакамеры, якія транслююць сітуацыю на іх у рэжыме анлайн.

Большую частку экрана займае інтэрактыўная карта Беларусі. Там паказваюцца паведамленні аб надзвычайных сітуацыях, якія паступілі да нас. Месца здарэння абавязкова суправаджаецца GPS-каардынатамі. Пры ўнясенні ў журнал яны звязваюцца з картай, і таму можна паглядзець, дзе менавіта адбыўся пажар, ДТЗ... Адзін клік камп'ютарнай мышы — і перад вамі з'яўіцца кароткая інфармацыя з датай і часам здарэння, апісаннем і хранalогіяй ліквідацыі, а таксама аб пацярпелых.

— Але мы назіраем і за міжнароднай абстаноўкай, — працягвае Валерый Рослік. — Вось зараз мы можам адсочваць ход таго, як у Карыбскім моры бушуе «Ірма». І калі да нас пойдзе магутны цыклон, як тое было ў 2013 і 2016 гадах, то мы гэта заўважым за некалькі дзён да таго, як яго траекторыя закране Беларусь. Акрамя таго, мы назіраем за сітуацыяй па лініі МАГАТЭ.

Мы мусім ісці з часам у нагу. Новыя тэхналогіі заўважна спрашчаюць работу. Раней жа было як? Дзяжурны прыняў паведамленне і запісаў яго ў журнал. А пасля змена пачынала апавяшчаць усе дзяржаўныя органы па тэлефоне. Гэта было вельмі нязручна і займала шмат часу.

Сістэма работы залы аператыўнага кіравання вельмі лагічная. Ёсць тры рэжымы сістэмы рэагавання на надзвычайныя сітуацыі: усядзённы, павышаны і надзвычайны. У залежнасці ад іх і працуе належным чынам зала аператыўнага рэагавання. Дзяжурная змена збірае інфармацыю, аналізуе яе і прымае неабходныя рашэнні. Сярод іншага, і апавяшчае дзяржаўныя органы пры неабходнасці — скажам, калі на краіну насоўваецца ўраган. Тут жа працуюць спецыялісты сувязі, каб ратавальнікі маглі ў найкарацейшыя тэрміны праінфармаваць насельніцтва аб пагрозе. Зараз гэта праяўляецца ў рассыланні sms і з'яўленні бягучага радка ў эфіры радыё і тэлебачання. Напрыклад, для Мінска даволі актуальнай апошнім часам стала праблема вельмі інтэнсіўных ліўневых дажджоў. А спецыяліст маніторынгу і прагназавання адсочвае інфармацыю з усіх датчыкаў у краіне, узаемадзейнічае з Гідраметам, запаўняе мабільную праграму МНС «Дапамога побач», складае карты надзвычайных здарэнняў.

— Разам з тым ні мы, ні сіноптыкі не могуць сказаць, дзе цыклон зменіць сілу і дзе менавіта ён пройдзе, — гаворыць Валерый Рослік. — Нас папярэджваюць, і мы ў сваю чаргу інфармуем дзяржорганы аб тым, каб па сістэме апавяшчэння яны паведамілі кіраўнікам прадпрыемстваў і галін улады, каб яны падрыхтаваліся да неспрыяльнай з'явы. І вельмі часта папярэджанне пацвярджаецца, але маштабы непагадзі, як правіла, меншыя. Таму гэта варта ўспрымаць як перастрахоўку, а не заяўляць, што прагноз чарговы раз апынуўся недакладным.

З нядаўняга часу Беларусь падключана да Еўрапейскай сістэмы апавяшчэння аб паводках EFAS. Гідралагічная інфармацыя штодня перадаецца з Цэнтра. А на інтэрактыўнай карце можна паглядзець, дзе зараз узровень вады можа павысіцца. Для Беларусі ж трансгранічныя паводкі бываюць актуальныя ўвесну. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці шмат прытокаў Прыпяці цякуць з поўдня на поўнач, дзе яшчэ лёд можа не растаць.

— Акрамя таго, мы збіраем і аналізуем радыяцыйную і пажарную абстаноўку, — кажа **інжынер аддзела маніторынгу Таццяна ВАРАБ'ЁВА.** — Таксама працуем і з касмічнымі здымкамі. Выявіць цеплавыя анамаліі можна са спадарожніка. Вось, напрыклад, у жніўні ў Беларусь усё-такі прыйшла 30-градусная спякота, ды і моцных дажджоў даволі доўга не было, але з дапамогай апаратуры мы змаглі кантраляваць абстаноўку ў нашай краіне.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

### Тым часам

На базе Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня» распачаўся XX Рэспубліканскі злёт юных ратавальнікаў-пажарных. У ім паўдзельнічаюць амаль 200 юнакоў і дзяўчат з усёй краіны. Дэлегаты з'яўляюцца членамі Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарных.

На працягу трох тыдняў 8 камандаў будуць спаборнічаць за права стаць лепшымі ў многіх конкурсах. Хлопцы і дзяўчаты пакажуць свае ўменні падчас самых разнастайных сітуацый, сярод якіх — выратаванне чалавека на вадзе, аказанне першай медыцынскай дапамогі. Таксама яны паўдзельнічаюць у зводных палявых вучэннях.

■ Дзяржава і бізнес

# ВЯСНА ДЛЯ ДРЭВААПРАЦОЎКІ?

## СФЕРА ПАЧАЛА ПРАЧЫНАЦЦА ПАСЛЯ МАДЭРНІЗАЦЫІ



**На думку старшыні Беларускага вытворча-гандлёвага канцэрна лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прадукцыі Юрыя НАЗАРАВА, дзякуючы мадэрнізацыі айчынныя прадпрыемствы дрэваапрацоўкі павысілі сваю канкурэнтаздольнасць. Акрамя таго дзяржаўныя інвестыцыі ў сферу дазволілі захаваць працоўныя калектывы, стварыць новыя працоўныя месцы, забяспечыць выпуск шырокай лінейкі якаснай прадукцыі. Таксама Юрый Назараў адзначыў, што дзякуючы інвестыцыям у галіну, стымулюецца і развіццё прыватнай ініцыятывы ў краіне.**

### Выдаткі апраўдваюць сябе

«Дзякуючы мадэрнізацыі прадпрыемствы павялічылі аб'ёмы вытворчасці, пашырылі асартымент выпускаемай прадукцыі, значна павысілі экспартны і імпартазамяшчальны патэнцыял. Калі 2014 і 2015 гады ў цэлым для галіны адзначаліся як найбольш складаныя, у першую чаргу ў сувязі з сітуацыяй на рынках збыту, то ўжо 2016 год можна назваць годам уздыму і ўстойлівай станоўчай дынамікі. А 2017 год яшчэ больш умацаваў пазіцыі прадпрыемстваў», — растлумачыў Юрый Назараў. Паводле яго слоў, адной з задач мадэрнізацыі прадпрыемстваў канцэрна вызначаўся выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі. У гэтым кірунку сёння вырашаецца вялікі пласт пытанняў. «У першым паўгоддзі сёлета прадпрыемствамі канцэрна выраблена імпартазамяшчальнай прадукцыі на 196,24 млн долараў, што да аналагічнага перыяду летась склала 152,3%. Умоўная эканомія валютных сродкаў за кошт пастаўкі на ўнутраны рынак — 51,64 млн долараў. Выпуск прадукцыі ажыццяўляецца па 35 таварных пазіцыях. Гэта тавары, якія раней вырабляліся ў краіне ў недастатковай колькасці альбо не выпускаліся наогул», — растлумачыў эксперт. Да такой катэгорыі сёння можна аднесці драўнянавалакністыя і драўнянастружкавыя пліты, фанеру, некаторыя віды паперы і кардону. «Мадэрнізацыя прынесла значны эканамічны эфект. Аб'ём вытворчасці ў цэлым па прадпрыемствах канцэрна з 2006 па 2016 год павялічыўся ў 7,8 раза — з 51 млн рублёў да 406 млн», — падкрэсліў Юрый Назараў.

### Павышаюць аб'ём экспарту на новых рынках

Гаворачы пра тэмпы росту экспарту, спецыяліст адзначае, што за сем месяцаў 2017 года прадпрыемствы канцэрна экспартавалі прадукцыі на 222,3 млн долараў, што на 44,1% больш за аналагічны перыяд летась. Асноўнымі рынкамі збыту за гэты час сталі Расія (82 млн долараў), Польшча — (41,4 млн долараў), Літва — (16,1 млн долараў), Украіна (14,8 млн долараў), Казахстан (12,7 млн долараў), Азербайджан — (7,8 млн долараў), Германія — (5,4 млн долараў), Латвія — (4 млн долараў), Венгрыя — (3,9 млн долараў). Усяго прадпрыемствы канцэрна экспартуюць прадукцыю ў 59 краін. Асноўнымі экспартнымі таварнымі пазіцыямі за сем месяцаў сёлета былі прадукцыя дрэваапрацоўкі (ДСП, ДВП, фанера, піламатэрыялы, мэбля) — 81,9% агульнага экспарту, папяровакардонная прадукцыя — 18,1%.

«Работа па дыверсіфікацыі экспарту прынесла свой плён. Прадпрыемствы канцэрна ў 2016 годзе выйшлі на рынкі 12 новых краін. Геаграфія экспарту папоўнілася такімі дзяржавамі як Бангладэш, Бахрэйн, Камерун, Кенія, ПАР, Шры-Ланка, Марока, ААЭ, Албанія, Ірак, Ізраіль і Люксембург. У цэлым доля краін далёкага замежжа ў аб'ёме экспарту за 2016 год склала 42,6%. За сем месяцаў сёлета гэты паказчык вырас да 44,2%. У 2017 годзе прадоўжана работа па дыверсіфікацыі экспарту. Прадпрыемствы дадалі ў спісы знешнеэканамічнага супрацоўніцтва і такія краіны як Бразілія, Іарданія, Канада, Кітай, Манголія, Сірыя. У гэтым годзе на новыя перспектыўныя рынкі экспартавана прадукцыі на суму 6,44 млн долараў», — удакладніў Юрый Назараў.

### Глыбіня перапрацоўкі вырашае

Наколькі паўплывала мадэрнізацыя на якасць працы традыцыйных прадпрыемстваў, можна вызначыць таксама і па глыбіні перапрацоўкі драўніны. Напрыклад, у скандынаўскіх краінах яна перавышае 90%. Кажучы пра нашу краіну, спецыяліст адзначыў, што ў 2006 годзе апрацоўчыя прадпрыемствы спажывалі 5,2 млн куб. м драўніны, у 2016 годзе — ужо ў 2 разы больш. «Прычым вялікая частка гэтай сыравіны пайшла ў глыбокую перапрацоўку: на вытворчасць драўняных пліт, фанеры, цэлюлозы, дзвярэй, вокнаў, будаўнічых канструкцый. Глыбіня перапрацоўкі з 38,5% у 2006 годзе павялічылася да 80% у 2016-м. У перспектыве, калі запрацуюць новыя цэлюлозна-папяровыя заводы, глыбіня перапрацоўкі перавысіць 90%», — растлумачыў спецыяліст. Паводле яго слоў, драўніна стала выкарыстоўвацца значна больш эфектыўна. «Можна прадаць 1,65 куб. м драўніны за 21,5 долара, а можна вырабіць з гэтага аб'ёму драўніны 1 куб. м пліты ДСП і прадаць, атрымаўшы ад 90 да 120 долараў. Яшчэ больш эфект будзе пры вытворчасці цэлюлозы і мэблі», — расказаў Юрый Назараў.

### Ніша для прыватнікаў?

Дарэчы, кажучы пра мэблю, эксперт таксама падкрэсліў, што для далейшага развіцця імпартазамяшчэння на яе вытворчасць якраз і будуць арыентавацца ў нашай краіне. «Патэнцыялу для развіцця мэблевага бізнесу ў нас у краіне дастаткова. Увод у эксплуатацыю мадэрнізаваных дрэваапрацоўчых комплексаў значна пашырыў магчымасці вытворцаў мэблі. За кошт айчынных матэрыялаў — драўняных пліт (ДСП, МДФ) — мэблевыя прадпрыемствы пачалі выпускаць эканамічную і запатрабаваную на рынку мэблю», — падкрэсліў спецыяліст. Юрый Назараў таксама адзначыў, што ў краіне створаны ўмовы і для развіцця прыватных невялікіх мэблевых кампаній, якія, дарэчы, цяпер аб'ядноўваюцца ў Асацыяцыю прадпрыемстваў мэблевай і дрэваапрацоўчай прамысловасці. «Гэта аб'яднанне з'яўляецца нашым партнёрам, мы разам працуем над развіццём дзяржаўна-прыватнага партнёрства і стымуляваннем бізнес-актыўнасці ў мэблевай і дрэваапрацоўчай вытворчасцях», — растлумачыў эксперт. Таксама, паводле яго слоў, за апошнія тры гады колькасць вытворцаў мэблі ў краіне павялічылася ўдвая і сёння ўжо перавышае 600 суб'ектаў гаспадарання.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# У Волі бульбы ўволю

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета пад «другі хлеб» сялянам выдзелілі па трыццаць сотак ураджайнай зямлі недалёка ад вёскі. Капаць бульбу на падмогу бацькам прыехалі дзеці з горадоў і сваякі з іншых вёсак. Цэлыя сямейныя дэсанты запоўнілі поле і на зайздрасць плённа папрацавалі на вынік — запасы на ўсю зіму. Бульба сёлета ўрадзіла добра — не менш чым па 150 мяхоў з кожнага ўчастка. На полі за Воляй капалі на сваіх дзялянках бульбу і жыхары суседніх вёсак — Карасёў і Малочкаў.

**Анатоль КЛЯШЧУК** *anatol@zviazda.by*, **фота аўтара.**









# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 верасня 2017 г.
№34 (418)




стар. 3

**І без 100 грам добра**



стар. 5

**На сумленні забудоўшчыкаў**



стар. 8

**Як штурмавалі віцебскую ратушу**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ГРОШЫ — СТРОГА ПА АДРАСЕ

## Ці ажывіць адраснае субсідаванне рынак жылля?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**НАПЭЎНА, адно з самых складаных пытанняў у краіне — кватэрнае. Вырашыць яго спрабуюць з пяцігодкі ў пяцігодку з дапамогай традыцыйнай ужо дзяржаўнай праграмы па будаўніцтве жылля. Там прапісваюцца пункты і палажэнні, якія пралічваюць усе магчымыя варыянты па паляпшэнні якасці новабудоўляў і зніжэнні іх кошту. Чыноўнікі, арыентуючыся на замежны вопыт, спрабуюць стварыць механізмы, якія прыцягваюць інвестараў і зніжаюць нагрузку на бюджэт.**

Сёлета ў краіне за сем месяцаў ужо пабудавана больш за 24,5 тысячы новых кватэр. У эксплуатацыю ўвялі 2095,9 тысячы квадратных метраў жылля. Прычым аб грамадзянах, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, таксама не забываюць. Для іх уведзена ў эксплуатацыю 700 тысяч квадратных метраў (33,4% ад агульнага аб'ёму). У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 590 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 28,2% ад агульнага пазычыка.

стар. 4

ЧЫЁ «НІЧЫЁ»?

# ЗНЕСЦІ — ЯК ПУД СОЛІ З'ЕСЦІ

## З-за пустуючых дамоў сельсаветы Лідскага раёна не могуць навесці парадак



**Інтарэсы мясцовых улад і нядбайных гаспадароў сутыкнуліся. Адны не могуць вырашыць лёс трухлявага жылля, а другія не хочуць уступаць у свае правы на дом, які застаўся ў спадчыну. А калі няма ўласніка, знесці такі дом немагчыма, паведамілі ў Лідскім раённым Савеце дэпутатаў. Нават калі ён бур'яном зарос...**

Землі Беліцкага сельсавета знаходзяцца якраз на ўскрайку Лідскага раёна. Пустуючых дамоў тут, лічы, праз адзін. І колькасць іх, паведаміў **старшыня Савета Сяргей КУЛЕШ,** з кожным годам павялічваецца. Ёсць такія, што пазарасталі па самы дах кустамі ды крапівой, некаторыя стаяць без дзвярэй і вокнаў, не кажучы пра агароджу, якая даўно павалілася. Вядома ж, такія дамы-прывіды не ўпрыгожваюць вёску, а, наадварот, надаюць ёй непрывабны, запусцелы выгляд.

— Сёння мы можам прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці грамадзян за парушэнне правілаў утрымання населеных пунктаў, — тлумачыць Сяргей Кулеш. — Прыйшлі, склалі пратакол. Чалавек адзін раз штраф заплаціў, другі... А на трэці, можа, задумаецца, што з гэтым домам рабіць — альбо наводзіць парадак, альбо прадаваць, альбо перадаць стары дом на баланс сельскага Савета пад знос.

Калі ёсць уласнік, усё проста. Гэты прынцып больш-менш працуе. Але часцей назіраецца іншая карціна. Уласнік быццам бы ёсць, але ў правы на дом не ўступае, не рэгіструе яго на сябе.

стар. 7

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ГОРАД, У ЯКІМ — ПАТЭНЦЫЯЛ КРАІНЫ

### *Спікер верхняй палаты парламента ўзяў удзел у навуковай канферэнцыі*

**На мінулым тыдні старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч прыняў удзел у VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў», прымеркаванай да 60-годдзя з дня стварэння Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ён звярнуўся з вітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі, а таксама ўручыў ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу Беларусі.**



У мінскай гарадской ратушы падчас мерапрыемства да 950-годдзя Мінска сенатар сумесна са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам уручылі ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу Беларусі заслужаным работнікам горада. Парламентарыі таксама перадалі кіраўніцтву мінскіх гарадскіх Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта віншавальны адрас. «Дзякуючы самаахданай і ўпартай працы многіх пакаленняў Мінск з'яўляецца адной з самых дастойных еўрапейскіх сталіц. Багатая гісторыя горада-героя дапаўняецца дагледжанымі зялёнымі тэрыторыямі і жылымі раёнамі. Сёння Мінск — цэнтр дзелавога, палітычнага, навуковага і культурнага жыцця Беларусі, дзе сканцэнтраваны значны эканамічны і інтэлектуальны патэнцыял краіны», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

## ПЛАН РАБОТЫ ЗАЦВЕРДЖАНЫ

### *Адбылося пасяджэнне Савета па ўстойлівым развіцці*

**Пад кіраўніцтвам нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР), намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яны Шчоткінай адбылося першае пасяджэнне Савета па ўстойлівым развіцці.**

У ходзе мерапрыемства былі разгледжаны пытанні выбудоўвання «беларускай архітэктуры» па дасягненні МУР, міжведамаснага ўзаемадзеяння ў сферы фарміравання нацыянальнай сістэмы паказчыкаў для маніторынгу МУР, а таксама міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтай сферы.

Нацыянальны каардынатар праінфармавала ўдзельнікаў аб прадстаўленні на форуме па ўстойлівым развіцці нацыянальнага даклада Рэспублікі Беларусь. Па выніках абмеркавання членамі Савета быў зацверджаны план работы на 2017 год.

## У ПЕРСПЕКТЫВЕ — КАРДЫЯЛАГІЧНЫ ЦЭНТР

### *Віцебск наведалі расійска-нямецкія кампаніі*

**У рамках візіту ў Віцебскую вобласць дэлегацыі з Германіі прайшла сустрэча члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, начальніка ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрыя Дзеркача з прадстаўнікамі расійска-нямецкіх кампаній.**

У ходзе перагавораў абмеркавана пытанне аб стварэнні цэнтра па аказанні кардыялагічнай дапамогі жыхарам Мёрскага, Браслаўскага, Пастаўскага, Верхнядзвінскага, Глыбоцкага, Шаркаўшчынскага раёнаў Віцебскай вобласці.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

ПЕРСПЕКТЫВЫ

# Беларусь — Усходняе партнёрства. Узаемавыгаднае супрацоўніцтва

**У Брусэлі адбылося 7-е штогадовае пасяджэнне Канферэнцыі рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства (CORLEAP). Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі перспектывы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва напярэдадні пятага саміту Усходняга партнёрства, які адбудзецца ў лістападзе 2017 года, а таксама намецілі асноўныя напрамкі дзейнасці CORLEAP на наступныя два гады.**

Чарговае пасяджэнне CORLEAP прайшло пад старшынствам старшыні пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова і старшыні Камітэта рэгіёнаў Еўрапейскага саюза Карла-Хайнца Ламберца. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў пасяджэння былі пытанні ролі мясцовых і рэгіянальных улад у забеспячэнні энергаэфектыўнасці, а таксама прасоўвання эканамічнага росту і занятасці на мясцовым узроўні. Праблема энергаэфектыўнасці, дарэчы, актуальная цяпер ва ўсім свеце ў частцы зніжэння шкодных выкідаў у атмасферу, павышэння энергетычнай бяспекі дзяржаў, а таксама даступнасці энергіі для спажыўцоў.

У сваім выступленні Аляксандр Папкоў падкрэсліў, што прыярытэтам свайго сустаршынства ў CORLEAP беларускі бок вызначыў сацыяльна-эканамічнае развіццё. У Беларусі аддаецца шмат увагі ўдасканаленню і рэальнаму ўмацаванню асноў мясцовага кіравання і самакіравання, пашырэнню правоў мясцовых Саветаў дэпутатаў. Беларуская прадстаўнікі рэгіянальных улад актыўна ўдзельнічаюць у еўрапейскіх ініцыятывах «Мэры за эканамічны рост» і «Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі». Вопыт развіцця мясцовага самакіравання ў іншых краінах з'яўляецца для нашай краіны цікавым аб'ектам вывучэння ў мэтах развіцця добрасуседскіх адносін. Адначасова Беларусь таксама адкрытая для дыялогу і гатовая падзяліцца сваімі напрацоўкамі ў гэтай галіне.

Удзельнікі пасяджэння CORLEAP прынялі рэкамендацыі да 5-га саміту Усходняга партнёрства 2017 года, а таксама абмеркавалі прыярытэтныя напрамкі далейшай работы гэтай арганізацыі. Плануецца, што наступнае пасяджэнне Канферэнцыі рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства адбудзецца 24 кастрычніка ў Ерэване.

У адпаведнасці з правіламі CORLEAP Беларусь у канцы верасня заканчвае сваё сустаршынства ў гэтай арганізацыі, якое доўжылася з кастрычніка 2016 года. На працягу наступнага года, да кастрычніка 2018-га, выконваць гэтыя абавязкі будзе Украіна.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# УРОКІ МУЖНАСЦІ І ЛЮБОВІ

## Зніжэнне ўвагі да патрыятычнага выхавання пагражае нацыянальнай бяспецы краіны



**Днямі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Пётр АТРОШЧАНКА вярнуўся з ваенна-патрыятычнай змены навучэнцаў сувораўскіх і кадэцкіх вучылішчаў Беларусі і Расіі, якая праходзіла ва Усерасійскім дзіцячым цэнтры «Арляня», што ў Краснадарскім краі. Вядома, парламентарый там не адпачываў. Убачанае яго настолькі ўразіла, што сваімі думкамі вырашыў падзяліцца з чытачамі «Звязды».**

— На працягу амаль месяца больш як 380 хлопцаў і дзяўчат з 15 навучальных устаноў Беларусі і Расіі адпачывалі на чарнаморскім узбярэжжы, а таксама ўдасканальвалі там сваю фізічную падрыхтоўку, вайсковую навуку і дысцыпліну. Акрамя сталічных сувораўцаў, у ваенна-патрыятычную змену трапілі найлепшыя выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў з Віцебска, Гродна, Магілёва і Мінска. З Расіі пуцёўкі ў «Арляня» атрымалі сувораўцы з Екацярынбурга, Казані, Пярмі, Чыты, Ульянаўска і Грознага, кадэты з Краснадара і Арэнбурга.

**— Пётр Аляксеевіч, некалькі гадоў таму мне давялося асвятляць работу падобнай ваенна-патрыятычнай змены ў Анапе. Як сёння помню, з якім энтузіязмам падлеткі «гулялі» ў вайскоўцаў...**

— Усе яны — патрыёты сваёй радзімы. Ваенна-патрыятычныя змены, якія ўжо на працягу 11 гадоў праходзяць па ініцыятыве камісіі Парламенцкага сходу па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю Саюзнай дзяржавы, дазваляюць наладзіць шчыльныя прафесійныя і сяброўскія сувязі паміж будучай ваеннай элітай Беларусі і Расіі. Падобныя змены — эталон таго, як трэба выхоўваць нашу моладзь. Вельмі добра было б, каб у наступным годзе на ваенна-патрыятычную змену трапілі не толькі суворавцы, нахімаўцы і кадэты, а і выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў.

**— Адзін з іх — «Рубеж» — дзейнічае на тэрыторыі вашай выбарчай акругі...**

— І я ўдзяляю яму шмат увагі. Ваенна-патрыятычны клуб у Крупках быў створаны некалькі гадоў таму. Цяпер ён аб'ядноўвае каля 120 школьнікаў. Пад кіраўніцтвам былога ваеннаслужачага, фаната сваёй справы, выхаванцы «Рубяжа» вывучаюць гісторыю краіны, удасканальваюць сваю фізічную падрыхтоўку, сустракаюцца з ваеннаслужачымі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і вайны ў Афганістане. Падлеткі выхоўваюцца ў духу патрыятызму, мараць насіць афіцэрскія пагоны. Будзем рэалістамі: не ўсе з іх стануць вайскоўцамі. Але тое, што яны атрымліваюць падчас так званых урокаў мужнасці, абавязкова спатрэбіцца ім у жыцці.



**— Адной з пагроз нацыянальнай бяспекі разам з тэрарызмам вы называеце зміншэнне ўвагі да патрыятычнага выхавання, зніжэнне патрыятычнага настрою. Пры гэтым ваенныя пагрозы ставіце на самае апошняе месца з магчымых...**

— У выпадку ваеннай пагрозы абарона сваёй зямлі без патрыятычных настрояў практычна немагчымая. Вось чаму так важна сёння на ўсіх узроўнях удзяляць увагу выхаванню будучых патрыётаў.

**— Лічыце, можна навучыць любіць Радзіму?**

— Вядома, можна! І каб любіць сваю Айчыну, размаўляць на роднай мове не самае галоўнае. Можна думаць па-англійску або панямецку і ў той жа час шмат карыснага рабіць на сваёй зямлі, праслаўляць яе. Праўда, у апошні час ваенна-патрыятычнае выхаванне ў нас «кульгае». І не таму, што мы нешта няправільна робім, проста час цяпер іншы. Калі я вучыўся ў 8—9-м класах, усе мае аднакласнікі хацелі паступаць у ваенныя вучылішчы, марылі пайсці ў армію. Гэта было святое! Цяпер жа большасць маладых людзей думае, як «адкасіць» ад службы ў войску. Адкуль у іх такі стэрэатып пра армію? Я лічу, што ўсе вытокі — у выхаванні, у першую чаргу бацькоўскім. Многія ўжо з самага дзяцінства нацэльваюць сваіх нашчадкаў на тое, што вучыцца ў Англіі ці дзесьці яшчэ за мяжой больш прэстыжна. Пра які патрыятызм у такіх сем'ях можа ісці гаворка? Праўда, падчас ваенна-патрыятычнай змены я пераканаўся, што не ўсё страчана.

**— У першым чытанні ўнесены змены ў Закон «Аб барацьбе з тэрарызмам», над якім вы актыўна працуеце. Ці гэта яго падштурхнулі тыя трагічныя падзеі, якія ў апошні час адна за адной ускалыхваюць увесь свет?**

— На цяперашні момант у нас дзейнічае Закон «Аб барацьбе з тэрарызмам» 2002 года. Але час ідзе, свет уступіў у эпоху глабалізацыі. З'яўляюцца новыя пагрозы і рызыкі. Таму наспела неабходнасць унесці дапаўненні і змены ў закон. Безумоўна, з улікам міжнароднай практыкі. Найбольш актуальнае — вызначэнне тэрміна «крытычна важныя аб'екты». Гэта неабавязкова аб'екты абароннай прамысловасці. Гэта арганізацыі, а іх у краіне налічваецца звыш 500, якія найбольш падыходзяць для здзяйснення тэрарыстычнага акта. Акрамя таго, у законапраекце размяжоўваюцца функцыі праваахоўных органаў па ажыццяўленні барацьбы з тэрарызмам, удасканальваецца механізм прызнання арганізацый тэрарыстычнай.

**Вераніка КАНЮТА.** kanyuta@zviazda.by

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# КАЛІ І БЕЗ 100 ГРАМ ДОБРА

## Дэпутаты выступілі з антыалкагольнай ініцыятывай

**«Нядаўна зайшлі з малодшым сынам у краму недалёка ад дома, — расказвае мінчанка, маці траіх дзяцей Вольга МАРТЫНЕНКАВА. — Узялі малако, хлеб, ёгурт, ідзём да касы. А там побач з цукеркамі і вафлямі — пляшкі з гарэлкай стаяць ды таннае віно. Сын глядзіць на чупа-чупсы, снікерсы, пераводзіць позірк на бутэлькі і пытаецца: «А што гэта такое?» Спрабую растлумачыць, што да чаго, і данесці, чаму набываць напоі мы не будзем. Думаю, і дарослы дарослаunion не заўжды абгрунтуе, чаму ўжываць не варта. А тут дзіця. Сын кіўнуў, змаўчаў, але, баюся, што патрэбных слоў я не адшукала. Ды яшчэ мужчына за намі папрасіў даць яму біклагу... Непрыемна, калі аказваешся ў такой сітуацыі, ды яшчэ і паўпływаць на яе не можаш».**

Другому сыну Вольгі, студэнту, нядаўна споўнілася 18 гадоў. І няхай маці перакананая ў тым, што хлопца выхавала добра, але думка, што цяпер ён можа сам набываць спіртное, не пакідае яе. «Я не разумею, чаму дагэтуль узрост, з якога можна прадаваць спіртныя напоі, яшчэ не паднялі. Няўжо хтосьці хоча зарабіць на здароўі нашых дзяцей?» — пытаецца Вольга.

Аднак нельга сказаць, што для таго, каб беларусы меней ужывалі алкагольных напояў, нічога не робіцца. Напрыклад, у Заводскім раёне Мінска шмат гадоў спрабуюць змагацца за тое, каб яго жыхары менш злоўжывалі спіртным. Па словах **Іны ПУСТАВІТ, намесніка галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце 21-й цэнтральнай раённай паліклінікі Заводскага раёна Мінска, сакратара камісіі па барацьбе з п'янствам Заводскага раёна,** ужо праводзіцца шмат культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў, каб заняць дзяцей і іх бацькоў, студэнтаў і працуючую моладзь па інтарэсах. Таксама ў раёне спрабавалі ўякасці эксперымента абмяжоўваць час продажу алкаголю. Аднак існуючае заканадаўства гэтага не дапускае: такога плана абмежаванні можна ўвесці ці падчас правядзення выпускных вечароў, ці падчас масавых спартыўных мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю здаровага ладу жыцця. А абмежаванне продажу ў начны час пад гэты пункт не падпадае.

«Мы звярталіся з прапановай да гандлёвых аб'ектаў, размешчаных паблізу ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, інтэрнатаў, прахадных прамысловых прадпрыемстваў. Так, уздоўж Партызанскага праспекта знаходзіцца 21 аб'ект гандлю не далей чым за 500 метраў ад іх», — тлумачыць Іна Пуставіт. Таксама была ідэя абмежаваць продаж не толькі ноччу, але і, напрыклад, падчас заканчэння змены на заводзе ці вучэбнага дня ў школе. Зноў жа заканадаўства такую меру выкарыстоўваць не дазваляе.

Між тым, у стане алкагольнага ап'янення здзяйсняецца большасць цяжкіх злачынстваў, гэта таксама і асноўная прычына сямейна-бытавога гвалту. Ужыванне алкаголю прыводзіць да атручвання з самымі цяжкімі наступствамі: у такім стане людзі атрымліваюць большасць траўмаў, якія часта прыводзяць да інвалідызацыі, тлумачыць спецыяліст.

З антыалкагольнай ініцыятывай выступілі і члены Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Да 1 кастрычніка дэпутаты разам з зацікаўленымі міністэрствамі ўнясуць свае прапановы па процідзеянні алкагалізацыі насельніцтва ва ўрад. З боку парламентарыяў такіх ініцыятыў цэлы шэраг. Гэта забарона на продаж алкаголю на аўтазапраўках, асобны ад іншых аддзелаў продаж спіртнога ў буйных магазінах, абмежаванне часу продажу, прапанова зрабіць больш жорсткімі патрабаванні да тары, у якой прадаецца спіртное (да аб'ёму і таго, што, напрыклад, піва ёсць і ў «бюджэтным» пластыкавым фармаце). А таксама падняцце ўзроставага парога продажу алкаголю, забарона выкарыстання алкагольнай тэматыкі ў напоях для дзяцей (дзіцячае шампанскае).



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

Пакуль галоўны аргумент тых, хто не падтрымлівае такія меры па процідзеянні алкагалізацыі насельніцтва, — эканамічная немэтазгоднасць, кажа **Вольга ПАЛІЦІКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі, адна з ініцыятараў унясення змен у заканадаўства.** Маўляў, гэта ж даходная частка бюджэту, з якой пасля выплачваецца грашовая дапамога неабароненым слаям насельніцтва. «Каб параўнаць эканамічную выгаду і шкоду, якую наносіць злоўжыванне алкаголем, — трэба мець методыку поўнай ацэнкі шкоднасці. У нас яе няма. Алкаголь складае 10% ад агульнага рознічнага тавараабароту, — лічыць дэпутат. — Так, мы атрымліваем прыбытак ад акцызаў, а колькі гіне на вытворчасці, атрымлівае траўмы ад таго, што выпівае, колькі ДТЗ па той жа прычыне? Гэтыя людзі выпадаюць з жыцця і эканомікі! Алкаголь з'яўляецца галоўнай прычынай сацыяльнага сіроцтва. Менавіта таму зараз адно з галоўных пытанняў — распрацаваць комплексную методыку ацэнкі шкодных наступстваў ужывання алкаголю ў цэлым для эканомікі краіны».

Міністэрства аховы здароўя канстатуе, што ўжыванне алкаголю на душу насельніцтва зніжаецца. «Так, у канцы 2016 года гэта было 8,8 літра на душу насельніцтва, г. зн. улічваюцца грамадзяне ўсіх узростаў.

Паводле даследаванняў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ужыванне больш як 8 літраў этылавага спірту на чалавека, старэйшага за 15 гадоў, прыводзіць да генетычнага выраджэння нацыі. А калі зрабіць падлікі па методыцы арганізацыі, для Беларусі гэты паказчык складзе 10,5 літра!» — прыводзіць аргументы Вольга Паліціка.

**Парламентарый кажа, што, напрыклад, не бачыць контраргументаў, чаму зараз жа нельга павысіць узрост, з якога можна набываць алкаголь. У краінах Скандынавіі барацьба з алкагалізмам налічвае не адно дзесяцігоддзе, і там гэта мера дзейнічае. У Нарвегіі з 18 гадоў можна набываць напоі, слабейшыя за 22 градусы, а з 20 гадоў — усе.**

«Чамусьці алкаголь у нас супастаўляецца з дарослацю: у 18 можна жаніцца, могуць у армію забраць, а выпіць нельга? Але ці гэтым мераецца ўзрост? Да таго ж у нас няма культуры піцця: часта людзі бяруць няякасны танны алкаголь, які сапраўды шкодзіць, і ўжываюць яго ў вялікай колькасці», — кажа дэпутат.

**Вера ШАЎЧЭНКА.**

СІТУАЦЫЯ

# Чый ты, нічыйны Шарык?

## Беспрытульным жывёлам таксама патрэбны закон



**У беларусаў ёсць прыказка: «Добры гаспадар і сабаку з хаты не выганіць у такое надвор'е». Згадваю, як у моцныя маразы, завею бацька забіраў у дом нашага любімца Бобіка — у цяпло, на мяккую посцілку. Наогул, гадоў трыццаць таму на вясковых вуліцах немагчыма было сустрэць ні бадзяжных сабак, ні бадзяжных катоў. Але з цягам часу чатырохногія беспрытульнікаў у сельскай мясцовасці з'ўлялася ўсё больш і больш.**

Толькі летась у Беларусі, як сведчыць статыстыка, было адлоўлена 69 тыс. бяздомных жывёлін, у тым ліку ў Мінску — 4 тыс. сабак і катоў. Для 3 тыс. з іх знайшлі новых гаспадароў. Вядома, у тым, што армія былых хатніх гадаванцаў з кожным годам павялічваецца, вінаваты чалавек. Заканчваецца дачны сезон, гараджане загружаюць, што называецца, пад завязку багажнікі і салоны аўтамабіляў хатнімі нарыхтоўкамі і вяртаюцца ва ўтульныя кватэры. А вось месца катам і сабакам, якія на лета былі вывезены на прыроду, часта не знаходзіцца. Магчыма, хтосьці з «жаласлівых» уладальнікаў і пусціць скупую слязу, ды з набліжэннем да горада яна хутка высахне. І кожны знойдзе апраўданне сваёй здрадзе: гэта ж жывёла, пракорміцца неяк у полі, лесе... З цягам часу сабакі, якія не дабілі зімняя сцюжа і голад, збіваюцца ў зграі — так лягчэй выжыць, і ствараюць пагрозу для людзей.

У рэдакцыю «Мясцовага самакіравання» патэлефанавала жанчына з Валожынскага раёна. Маўляў, адны непрыемнасці ад бадзяжных сабак. Збіраюцца каля жывёлагадоўчых фермаў і нават на адной з іх загрызлі цяля. «Няўжо праўда?» — не зусім верылася ў гэта. Такое надзвычайнае здарэнне мясцовага маштабу стала б набыткам грамадскасці праз інтэрнэт. Але чаго толькі не бывае ў гэтым жыцці. І журналіст «МС» вырашыла праверыць інфармацыю.

— Не выключаю: чыста тэарэтычна такое можа быць. Але пра тое, што ў нашым раёне бадзяжныя сабакі прычынілі шкоду маладняку, мы не чулі. Скаргі ад кіраўнікоў гаспадарак, грамадзян не паступалі, як і заяўкі на адлоў «агрэсараў», — кажа **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Валожынскага райвыканкама Анатоль АЛІЕЎ.**

Ды і, на маю думку, утаіць такі выпадак немагчыма, людская пагаласка даўно б разнесла навіну па ўсёй ваколіцы.

— У Валожынскім раёне налічваецца 430 населеных пунктаў, — працягвае Анатоль Ядулаевіч. — На яго тэрыторыі безліч садовых таварыстваў, асабліва вакол пасёлка Ракаў, што бліжэй да сталіцы. Калі ў раёне пражывае 30 тыс. чалавек, то летам у тую ж ракаўскую зону прыязджае яшчэ 25 тыс. дачнікаў. І многія прывозяць з сабой хатніх гадаванцаў. Самі па сабе каты і сабакі бадзяжнымі не становяцца. Тут адназначна прысутнічае чалавечы фактар. Таму праблема нічыйных чатырохногіх ёсць, але не скажу, што яна стаіць асабліва востра.

На тэрыторыях аграгарадкоў пытаннямі арганізацыі адлову безнагляднах жывёл займаюцца арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. А ў асобных населеных пунктах абавязкі па адлове бадзяжных катоў і сабак ускладзены на сельвыканкамы.

— Мы заказваем спецыялізаваную арганізацыю, якая мае адпаведную ліцэнзію на адлоў бадзяжных жывёлін. Іх не страляюць, як мяркуюць людзі, а спецыяльнымі сродкамі ўводзяць у стан сну. Аналагічную работу праводзяць і сельскія Саветы. Адлоўленых жывёлін адвозяць у пункты часовага ўтрымання. Пакінуць у сябе безнаглядных чатырохногіх мы не можам. Паколькі для іх павінна быць адведзена спецыяльнае памяшканне, уладкаваны вальеры. Акрамя таго, іх трэба забяспечыць харчаваннем, прывіць, наняць абслугоўваючы штат, ветэрынара. А гэта вялікія расходы... У сельскіх Саветах прадугледжана фінансаванне на адлоў з тых сродкаў, якія ідуць на добраўпарадкаванне, ды яно вельмі абмежаванае, — тлумачыць мой суразмоўнік. — Справа яшчэ ў тым, што пры адлове цяжка вызначыць, ці ёсць у сабакі ўладальнік. Як правіла, яны без ашыйнікаў. Калі ў ашыйніку, то шукаем гаспадара.

Звычайна ў квартал адлоўліваюць да 10 катоў і сабак, канстатуе Анатоль Аліеў. Усё залежыць ад паступлення заявак ад насельніцтва, юрыдычных асоб.

Бясспрэчна, гуманнасць у адносінах да братоў нашых меншых з боку чалавека, адказнасць за тых, каго прыручыў, магла б зменшыць маштабы бедства. І яшчэ, на маю думку, павінен быць больш жорсткі закон для тых, хто бесчалавечна абыходзіцца з хатнімі гадаванцамі, — да пазбаўлення волі. Закон «Аб абыходжанні з жывёламі» спрабавалі прыняць яшчэ ў 2001 годзе. З тых часоў законапраект рэгулярна адкладваўся, у яго ўносіліся дапаўненні, змяненні. У 2011-м ён не прайшоў праз другое чытанне. І вось чарговы раз з'явілася надзея, што хутка закон будзе прыняты. Як лічаць абаронцы жывёл, у ім палепшаны правілы адлову жывёл, прадугледжана дакладная забарона на адстрэл. (Не сакрэт, што часта няшчасных забівалі на вачах дзяцей і дарослых, асабліва не цырымоніліся з гэтым у сельскай мясцовасці.) Законапраект прадугледжвае стварэнне месцаў часовага ўтрымання ў раённых цэнтрах, а пры неабходнасці і ў меншых населеных пунктах. Прычым тэрмін утрымання тут жывёл павялічваецца. Стане больш жорсткай і адказнасць за парушэнне асобных нормаў утрымання. У нядобрасумленных уладальнікаў могуць забраць гадаванца або абмежаваць правы на яго.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

# ГРОШЫ — СТРОГА ПА АДРАСЕ

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар. «МС».)**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Акрамя таго, у краіне сёлета ўжо павялічаны аб'ём уводу жылля з дзяржпадтрымкай. Згодна з пастановай Савета Міністраў №669 прадугледжана размеркаванне паміж рэгіёнамі 135 мільёнаў рублёў крэдытных рэсурсаў банкаў, а таксама павелічэнне аб'ёму ўводу жылля з дзяржпадтрымкай на 50,2 тысячы кв. м, у тым ліку для шматдзетных — на 21 тысячу кв. м. Такім чынам, для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў і якія будуюць жыллё з дзяржаўнай падтрымкай, сёлета будзе ўведзена 501 498 тысяч кв. м жылля.

Разам з тым, гледзячы на дынаміку ўводу ў эксплуатацыю жылых памяшканняў з 2011 па 2016 год, варта адзначыць, што ў краіне назіралася яе зніжэнне. Паводле звестак Белстата, у 2011 годзе ў краіне ўзводзілася 5480,1 тысячы квадратных метраў жылля, а ўжо ў 2015-м — 5055,3 тысячы «квадратаў». За мінулую пяцігодку найбольшую колькасць квадратных метраў увялі ў 2014 годзе — 5523 тысячы «квадратаў». Новая пяцігодка пачалася з больш нізкага паказчыка. Летась увялі толькі 4284,7 тысячы квадратных метраў жылля. Што датычыцца ўводу ў эксплуатацыю жылля сёлета, то ў параўнанні з 2016-м тут таксама назіраецца адмоўная дынаміка. Уведзеныя за 7 месяцаў 2 095,9 квадратнага метра складаюць 88,1% ад таго ж паказчыка ў мінулым годзе.

Нагадаем, што ўрад краіны ўжо зацвердзіў Дзяржаўную праграму «Будаўніцтва жылля» на 2016—2020 гады. Развіццё жыллёвага будаўніцтва ў гэтай пяцігодцы прадугледжвае скарачэнне долі бюджэтнага фінансавання і пашырэнне выкарыстання пазабюджэтных крыніц. Гэта можна ўбачыць на прыкладзе Указа №240, які прыцягвае да будаўніцтва жылля банкаўскі сектар. Дзяржаўнай праграмай таксама прадугледжана павелічэнне ўзроўню забяспечанасці насельніцтва жыллём з 26,36 кв. м на чалавека ў 2015 годзе да 27,3 кв. м у 2020-м. Пры гэтым у агульным аб'ёме ўводу ў эксплуатацыю жылых дамоў да 2020 года не менш за 40% будзе прыходзіцца на індывідуальныя жылыя дамы, а ўсе шматкватэрнікі плануецца будаваць з выкарыстаннем энергаэфектыўных тэхналогій — гэта дазволіць знізіць эксплуатацыйныя выдаткі.

Для задавальнення патрэб у індывідуальным жыллёвым будаўніцтве, а таксама ў мэтах загрузкі будаўнічага комплексу краіны будуць распрацаваны магчымасці ўзвядзення індывідуальнага жылля па дзяржаўным заказе.

Асаблівая ўвага ў дзяржпраграме ўдзелена будаўніцтву жылля для грамадзян, якія маюць права на дзяржаўную падтрымку. Новы механізм адраснага субсідавання ўжо зацікавіў беларусаў. Першыя звароты па крэдыты ў адпаведнасці з Указам №240 аб адрасным субсідаванні ў жыллёвым будаўніцтве ўжо на падыходзе.

**Банкі гатовыя выдаваць крэдыты адразу пасля вызначэння пераліку дамоў, якія падпадаюць пад дзеянне ўказа. Чакаецца, што, калі выканкамы пачнуць прымаць рашэнне аб выдачы субсідый, грамадзяне будуць звяртацца ў банкі, дзе ўжо гатовыя разглядаць іх дакументы.**

Міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Чорны напярэдадні адзначыў, што зараз кошт квадратнага метра жылля з дзяржпадтрымкай складае 804 беларускія рублі. Паводле яго слоў, будаўнічая галіна рухаецца ў бок выраўноўвання кошту квадратнага метра жылля і сярэдняга заробку.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
kryzhevich@zviazda.by

СВАЁ ЖЫЛЛЁ

# НОВАБУДОЎЛІ: ПОГЛЯД З РЭГІЁНА

## Калі ў сталіцы чаканне сваёй чаргі на жыллё расцягваецца на гады, у некаторых рэгіёнах такой праблемы няма

**Мы паразмаўлялі з начальнікам аддзела архітэктуры і будаўніцтва Лельчыцкага райвыканкама — галоўным архітэктарам Дзмітрыем ШПІГАНОВІЧАМ і высветлілі, якія тэндэнцыі сёння пераважаюць у жыллёвай палітыцы аднаго з палескіх рэгіёнаў.**



### Пяць паверхаў

— Пачынаючы з 2006 года мы ўводзім штогод у сярэднім па адным шматпавярховым жылым доме, — расказвае Дзмітрый Шпігановіч. — Гэта як мінімум. Адзіны быў невялікі на 12 кватэр. Астатнія ў асноўным ад 40 да 60 кватэр. Дамы на 60 кватэр будуюцца кааператывамі або калектывамі індывідуальных забудоўшчыкаў, якія ствараюцца ў нас на тэрыторыі. На 40 — гэта для льготнай катэгорыі грамадзян, напрыклад, для шматдзетных сем'яў. У нас незаселеных дамоў няма.

У Лельчыцкім раёне пражывае каля 24 000 чалавек. З сельскай мясцовасці многія пераязджаюць у райцэнтр і тут ужо будуюць жыллё. Набываць яго дапамагае Указ №13 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў». Ён дае магчымасць крэдытавання на льготных умовах. Прычым, калі выкарыстоўваюць такі крэдыт, чалавек павінен у пабудаваным памяшканні жыць, а не здаваць яго камусьці іншаму, хоць час ад часу запыт на арэнду жылля ў пасёлку існуе.

У жніўні здалі новы жылы дом: 30 кватэр — з дзяржаўнай падтрымкай і 30 кватэр — камерцыйнае жыллё. Калі пачалі размяркоўваць жыллё шматдзетным сем'ям, 17 чалавек выказалі жаданне ўзяць, яшчэ 13 кватэр засталіся пакуль незанятымі. Вельмі шмат адмоўнікаў са спіса. Дзмітрый Шпігановіч тлумачыць: «Людзі адмаўляюцца, таму што альбо пакуль не хочуць паляпшаць жыллёвыя ўмовы, напрыклад, дзеці яшчэ вучацца альбо дзяўчаты з'язджаюць за мужам у Мінск ці Гомель, але ў асноўным таму, што яны ўжо будуюць прыватны дом».

### Уласны дом

Дзмітрый Шпігановіч, як і многія жыхары Лельчыц, узяў для сябе ўчастак і таксама пабудаваў прыватны дом. «У нас спецыфіка раёна такая, што людзі ў асноўным хочуць будаваць прыватныя домаўладанні. Прыкладна штомесяц ўводзіцца ад 3 да 5 такіх жылых дамоў і яшчэ 4—5 пасля рэканструкцыі. Аднапавярховыя — каля 100 квадратаў, двухпавярховыя альбо з мансардай — ужо да 200 квадратаў». За аб'язной гарадскога пасёлка размешчаны мікрараён «Заходні». Першая чарга забудовы была распрацавана тры гады таму: больш за 240 участкаў. Зараз засталося толькі 60, якія яшчэ можна размеркаваць. Людзі прыходзяць, выбіраюць і пачынаюць сваё будаўніцтва: дазвол даецца на тры гады, але потым тэрмін можна працягнуць яшчэ на два. Сёлета ўжо два чалавекі ў мікраараёне ўвялі жылыя дамы і, мяркуецца, яшчэ пяць паспеюць да канца года. Часам прыватнікі зацягваюць з будаўніцтвам, але, па словах галоўнага архітэктара, «укласціся» ў пяцігадовы тэрмін усе паспяваюць.

У аддзел архітэктуры і будаўніцтва райвыканкама можна звярнуцца па атрыманне дазвольнай і ўзгадненне праектнай дакументацыі. Спецыялісты выязджаюць на месца, выносяць чырвоныя лініі (да якой мяжы можна будаваць), пазначаюць, што праектам не прадугледжана. Напрыклад, калі толькі пачынае забудоўвацца новы мікрараён, не кожны ведае, дзе будзе асфальт, тратуар, дарожка...

### Новыя трэнды

Сярод тэндэнцый у будаўніцтве можна адзначыць змены ў планіроўцы. Праекты робяцца адразу пад чалавека, збіраюцца прапановы. Усім прыемна, уваходзячы ў кватэру, не ўпірацца ў маленькі калідорчык, а заходзіць у прасторную галерэю. Кухні ўжо таксама не будуюцца «два на тры» метры, робяцца большымі. Але ў рэгіёне, напрыклад, няма запытаў на кватэры-студыі, як у буйных гарадах.

Існуюць новыя падыходы да прымянення матэрыялаў. Калі раней выкарыстоўвалі больш металу, цяпер ужываюць поліпрапілен. Ад металу адыходзяць, бо гэта больш працаёмка, а тэрмін службы яго толькі каля 30 гадоў (для параўнання, поліпрапілена — 50), затым яго трэба перакладаць. Калі раней сцены рабілі з блока ці цэглы, то цяпер тарцовыя сцены альбо тыя, якія больш схільныя да цеплаперадачы, уцяпляюцца, фасады афарбоўваюцца. Дахі дамоў робяць не з шыферу, а з металу.

Мы праехаліся па Лельчыцах і паглядзелі два новыя мікрараёны, будаўніцтва якіх амаль завершана. На месцы першага раней быў стары яблыневы сад, які амаль не пладаносіў. Зараз там узвышаецца некалькі шматпавярховікаў. Яшчэ запланаваны 40-кватэрны жылы дом, пакінуты пляцоўкі пад дзіцячы садок і фізкультурна-аздараўленчы цэнтр.

На месцы другога раней размяшчаўся калгасны двор. Першапачаткова тут пабудавалі гімназію на 650 вучняў, тым самым знялі праблему з месцамі ў школах. У асноўным у мікрараёне жывуць маладыя сем'і. Дамы зроблены ў адным стылі з гімназіяй, таму мікрараён выглядае як адно цэлае. У плане — узвесці тут яшчэ два шматкватэрнікі, але гэта зробяць толькі ў выпадку, калі набярэцца дастатковая колькасць ахвотных.

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by

### Наш каментарый

**Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гомельскага аблвыканкама Ядвіга БЛАТУН:**

— За восем месяцаў гэтага года ў нас было пабудавана больш за 300 тыс. м² жылля, у тым ліку з дзяржпадтрымкай каля 49 тыс. м², індывідуальнага — 131 тыс. м², шматкватэрных дамоў у сельскіх населеных і малых гарадскіх паселішчах — 85 тыс. м², шматкватэрных у гарадах — 177 тыс. м² (у тым ліку для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — амаль 71 тыс. м²).

Сёння мы распачалі вялікую справу па ўсёй краіне — гэта работа па Указе №240 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў», які ўступіў у сілу. Гаворка ідзе пра тое, што грамадзянам, якія стаяць на ўліку, маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і атрымліваюць нельготныя крэдыты, дзяржава пагашае частку працэнта па такіх крэдытах, а некаторым катэгорыям і асноўны доўг (гэта шматдзетныя сем'і, часткова — сіроты). Сёння па гэтым указе пачала працаваць уся краіна.

У Гомельскай вобласці яшчэ будуюцца дамы з тэхніка-эканамічнай дапамогай Кітая. Такія ёсць і на тэрыторыі іншых рэгіёнаў. У нас — шэсць дамоў: тры ўжо ўведзены ў эксплуатацыю і тры дабудоўваюцца, будуць уведзены ў кастрычніку. Гэта дамы сацыяльнага карыстання: для неабароненых катэгорый грамадзян. У праграме тры этапы, апошні запланаваны на 2019—2020 гады.


Фота Надзеі БУЖАН.

БУДОЎЛЯ З «БАРАДОЙ»

# ДАВЯРАЙ І — ПРАВЯРАЙ

## Каб аб'ект не ператварыўся ў даўгабуд, а грошы дольшчыкаў не пайшлі «налева»

**Забудоўшчык марыць як мага хутчэй і даражэй распрадаць кватэры ў доме, які ўзводзіцца (пажадана яшчэ на стадыі катлавана, каб з самага пачатку праекта яго партфель аж трашчаў ад купюр). Мары дольшчыка куды прасцейшыя — у названы ў дагаворы тэрмін атрымаць ключы ад сваіх «квадратаў» і заняцца рамонтам. І калі задумкі першага часцей за ўсё спраўджваюцца, то другому даводзіцца не так лёгка: напярэдадні прапісанага ў дакументах тэрміну здачы будучы навасёл, хутчэй за ўсё, атрымае дадатковае пагадненне, згодна з якім тэрміны ўводу аб'екта ў эксплуатацыю будуць перанесены «па не залежных ад забудоўшчыка прычынах».**

У Мінску засталося чатыры дамы са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва, паведаміла нам **начальнік аддзела жыллёвага будаўніцтва камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Ірына ГОНТАРАВА**. Яна адзначыла, што ўвесці іх у строй плануецца да канца года.

Да гэтых аб'ектаў адносяцца: дом №6 у межах вуліц Маякоўскага — Аранжарэйна, дом №6 па вуліцы Быхаўскай — Авакяна («Прамэкс»), дом па вуліцы Кальцова («Фрэлізй-сэксім») і дом на праспекце Дзяржынскага («Жылбуд-камплект»). Асноўная праблема ў забудоўшчыкаў пры зацягванні тэрмінаў будаўніцтва — адсутнасць фінансавання, адзначыла Ірына Гонтарава.

***

Праўда, у мінулыя гады не ўсе разборы з жыллём заканчваліся добра. Днямі завяршылася справа, якая цягнулася ўжо немала часу: у судзе Фрунзенскага раёна Мінска быў агучаны прысуд забудоўшчыку «СКВІЧ», які ўзяўся за ўзвядзенне жылога дома ў Каменнай Горцы, а потым не толькі зацягнуў усе тэрміны, але і правёў, як высветлілася, махінацыі з грашыма. Будынак пачаў расці на скрыжаванні Нёманскай і Налібоцкай яшчэ ў 2011 годзе. У 2013-м дольшчыкі, якія стаміліся чакаць ключы, запісалі відэазварот да Прэзідэнта. Услед рушыла праверка, у выніку якой вызначылі, што кіраўнік кампаніі-забудоўшчыка (футбольны клуб «СКВІЧ») відавочна не па прызначэнні скарыстаўся грашыма, якія былі выплачаныя за жыллё.

«Падставай для крымінальнага праследавання сталі выяўленыя факты выкарыстання дадзеней службовай асобай сродкаў дольшчыкаў жылога дома ў сталічным мікрараёне Каменная Горка ў суме звыш 14 млрд рублёў на іншыя мэты», — паведамлялася



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

на сайце Камітэта дзяржкантролю. Дом у выніку ўсё ж быў здадзены (толькі яго жылая частка, бо меркаваныя паркоўкі і камерцыйныя плошчы ўсё яшчэ нагадваюць катакомбы), а вось справа кіраўнікоў клуба не рассеялася: кіраўнік, а таксама яго сын (ён жа — намеснік кіраўніка) сталі фігурантамі больш чым трыццаці крымінальных спраў, якія былі аб'яднаны ў адну вытворчасць.

У выніку за кратамі і пад аховай апынуліся бацька і сын П., адзін 1958 года нараджэння, другі — 1985-га. Іх «паслужны» спіс настолькі разнастайны, што на тое, каб зачытаць усе артыкулы і абставіны, у суддзі пайшло амаль пяць хвілін.

Суд прызнаў старэйшага П. вінаватым у завалоданні маёмасцю, учыненым службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў у асабліва буйным памеры. Яго таксама прызналі вінаватым у наўмысным (насуперак інтарэсам службы) здзяйсненні з карыслівай ці іншай асабістай зацікаўленасці дзеянняў, якія пацягнулі прычыненне істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзян, дзяржаўным інтарэсам.

Падсуднаму было прызначана канчатковае пакаранне: пазбаўленне волі на тэрмін восем гадоў з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады на тэрмін пяць гадоў. Адбываць пакаранне былы забудоўшчык будзе ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

Яго сына таксама прызналі вінаватым і прызначылі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін чатыры гады з канфіскацыяй маёмасці.

***

Дарэчы, «СКВІЧ» — далёка не першы ў гісторыі Беларусі забудоўшчык, які трапіў у поле зроку праваахоўнікаў і які атрымаў за свае дзеянні рэальны тэрмін зняволення.

У канцы 2012 года суд Першамайскага раёна Мінска прыгаварыў бізнесмена Сяргея Дземчука да васьмі гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Ён прызнаны вінаватым у махлярстве. У ходзе следства і суда было даказана, што Дзямчук сабраў грашовыя сродкі дольшчыкаў нібыта для будаўніцтва жылога комплексу ў раёне былога аўтавакзала «Маскоўскі» ў Мінску, аднак на самай справе выкарыстаў гэтыя грошы не па мэтавым прызначэнні, а для падтрымання фінансавага стану падкантрольных яму фірмаў.

А ў 2014 годзе на восем і пяць з паловай гадоў адправіліся ў калонію ўзмоцненага рэжыму службовыя асобы акцыянернага таварыства «Антасам», абвінавачаныя ў крадзяжы грошай дольшчыкаў жылога комплексу «Самацветы». Пасля таго як практычна цалкам аплачаная дольшчыкамі будоўля замерла, людзі запатрабавалі комплексны праверкі кампаніі і звярнуліся ў праваахоўныя органы. У выніку супраць вядучых службовых асоб кампаніі было ўзбуджана некалькі крымінальных спраў па фактах махлярства з грашыма дольшчыкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

### У тэму

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пашыраным пасяджэнні Выканкама НАК па пытанні правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе даручыў вырашыць у Мінску праблему даўгабудаў да правядзення ў краіне гэтых буйных спаборніцтваў.**

**«Прывядзіце горад у парадак, каб не было ніводнага даўгабуда. Ніякіх платоў, якія закрываюць гэтыя будоўлі, быць не павінна», — даручыў кіраўнік дзяржавы.**

МЕРКАВАННІ

# Ці ёсць у вас уласнае жыллё і як вы яго набылі?

**Гэтае пытанне актуальнае ва ўсе часы, таму мы задалі яго тым беларусам, якія маюць уласныя кватэры, і тым, хто не спяшаецца ўвязвацца ў куплю свайго жылля.**

**Натарыус Марыя ЯРМОЛЕНКА:**

— Бацькі з самага майго дзяцінства практычна ва ўсім адмаўлялі і сабе, і мне, і майму старэйшаму брату. У нас не было нейкіх цацак, таму што яны збіралі грошы нам на жыллё. У іх была такая мэта: каб дзеці выраслі і кожны меў свой уласны куток. Спачатку атрымалася набыць кватэру брату, для гэтага бралі крэдыт, які склаў каля трэціны кошту кватэры. Астатняе — гэта тое, што назбіралі, чым дапамаглі бабулі і дзядулі. Як гаворыць, збіралі «з міру па нітцы». У гэтай кватэры з братам жыла і я, паколькі на другую жылплошчу грошай не было. Потым, калі памерлі бабулі і дзядулі, — якія, дарэчы, жылі ў вялікіх гарадах, — засталася спадчына. Яе частка і склала пачатковы капітал для куплі маёй кватэры. Астатняе — гэта таксама крэдыт, у кагосьці нешта яшчэ пазычылі. Так я і пераехала ва ўласнае жыллё. Мне здаецца, калі браць крэдыт, то пабудаваць жыллё самому можна, але стаяць у той жа чарзе — гэта ж вельмі доўга. Калі ты жывеш на здымнай кватэры, то тую частку грошай, якую мог бы адкласці, ты плаціш арэндадаўцу. Якая б зарплата ў цябе ні была — як назбіраць, калі значная частка ідзе на арэнду?

**Лагіст Ганна ВІЛЬЧЫНСКАЯ:**

— Я нарадзілася ў Мінску і пражыла тут шмат гадоў. Жыла ў адной кватэры з мамай і братам. Потым брат пераехаў, я выйшла замуж, пераехала да мужа, нарадзіла дачку. У шлюбе мы пражылі нядоўга, пасля чаго я з дачкой вярнулася назад да маці. Грошай было няшмат, аб уласнай кватэры ў сталіцы і гаворкі быць не магло. І я вырашыла ўсё змяніць: паехаць у Маскву, знайсці добрую працу... У Маскве на здымных кватэрах я пражыла 8 гадоў, пасля чаго вырашыла, што з мяне хопіць. Мы з другім мужам пазычылі трэціну сумы на кватэру, астатняе ўзялі ў крэдыт. Наша кватэра знаходзіцца недалёка ад кальцавой аўтадарогі, аднак усё роўна каштуе немагчыма дорага. Зараз мы зрабілі рамонт, абжываемся, аднак наперадзе яшчэ доўгія гады вяртання грошай. Але я шчаслівая: жыць ва ўласнай кватэры і ведаць, што цябе дакладна не выселяць, не павысяць арэндную плату, — гэта здорава.

**Прадавец у краме тэхнікі Сяргей ДУБРОЎСКІ:**

— Зараз гэтае пытанне для мяне як ніколі актуальнае, таму што ў дадзены момант я займаюся афармленнем крэдыту на ўласную кватэру. Нам з жонкай ужо за 30 гадоў, пажаніліся мы зусім юнымі. Жылі дзе прыйдзецца: спачатку ў маіх бацькоў, потым у бабулі, потым здымалі кватэру, потым са сталіцы пераехалі ў Барысаў, дзе спачатку жылі ў сваякоў, а потым арандавалі жыллё. У выніку мы вярнуліся ў Мінск і знялі жыллё. Пра сваю кватэру мы марылі даўно, аднак наша «сярэдняя» зарплата не дазваляе нам ні адкласці, ні тым больш што нешта купіць. Дапамаглі мае бацькі: яны прадалі сваю кватэру і пераехалі ў аднапакаёвую, а тыя грошы, што засталіся ад продажу, аддалі нам. Гэтага хапіла на першы ўзнос, астатняе вырашылі браць у крэдыт. Штомесячныя плацяжы будуць, мякка кажучы, немаленькія. І пакуль не зусім ясна, як іх выплачваць. Што ж, будзем старацца выплачваць, таму што вельмі хочацца жыць ва ўласнай кватэры.

**Спецыяліст па сувязях з грамадскасцю кампаніі Vizor Interactive Веранiка РЭЎТ:**

— У мяне свайго жылля няма. І калі шчыра, то я разумею, што купіць кватэру ў мяне адной шанцаў вельмі і вельмі мала. Нават пры несярэдняй зарплаце па Мінску трэба адмовіцца ад усяго на шмат гадоў, каб набыць сваё жыллё, хутчэй за ўсё, давядзецца ўзяць крэдыт у банку... Таму будаўніцтва жылля ў Беларусі я зараз не разглядаю, паколькі планую з'ехаць у іншую краіну. Магчыма, за мяжой у мяне атрымаецца купіць кватэру, а да гэтага планую яе здымаць. Жыллё ў Мінску для мяне — гэта нешта недасягальнае. У мяне ёсць знаёмыя, якія куплялі кватэры ў Мінску, але ім гэта ўдавалася толькі дзякуючы бацькам і сваякам. Акрамя таго, яны сур'ёзна эканомілі. І зноў пытаюся: калі ты адзін, дапамогі бацькоў, сваякоў няма, спадчына адсутнічае, — купіць жыллё ў Мінску нерэальна. І я ведаю вельмі шмат людзей, якія доўгія гады адкладалі і эканомілі проста на ўсім, а потым яшчэ і аддавалі даўгі. Падумайце, ці трэба вам гэта.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
- ✓ Оценка всех видов собственности

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ №2, Г. ГОМЕЛЬ» 8 (0232) 77 57 48

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (здание весовой) с инв. №342/С-70006, заводской инв. №10024, общей площадью 34,7 кв. м (составные части и принадлежности: весовая площадка бетонная, бетонное крыльцо). – Капитальное строение (здание склада (инв. №10025)) с инв. №342/С-79904, заводской инв. №10025, общей площадью 59,5 кв. м. – Капитальное строение (здание РММ) с инв. №342/С-69984, заводской инв. №101050, общей площадью 1166,1 кв. м (составные части и принадлежности: панельный гараж). – Капитальное строение (здание котельной) с инв. №342/С-70008, заводской инв. №101051, общей площадью 210,7 кв. м. – Капитальное строение (здание трансформаторной подстанции) с инв. №342/С-70009, заводской инв. №40011, общей площадью 51,4 кв. м. – Капитальное строение (башня Рожновского) с инв. №342/С-70010, заводской инв. №10021, высотой 22,37 м, площадью застройки 9,5 кв. м. – Капитальное строение (битумохранилище) с инв. №342/С-70005, заводской инв. №10023, высотой 8,50 м, площадью застройки 58 кв. м – Капитальное строение (ограждения ст. Жердь) с инв. №342/С-70011, заводской инв. №200016, железобетонный забор, протяженностью 363,0 м, высотой 2,20 м. – Капитальное строение (благоустройство асфальтобетонное) с инв. №342/С-70012, заводской инв. №200020, протяженностью 757,2 м, площадью застройки 16126 кв. м. *Объекты расположены на земельном участке (для обслуживания асфальто-бетонного завода) с кадастровым номером 325076200001000003 площадью 5,4237 га.* – Капитальное строение (подъездной железнодорожный путь необщественного пользования к АБЗ ст. Жердь) с инв. №342/С-70013, заводской инв. №10022, протяженностью 435,3 м. *Объект расположен на земельном участке (для обслуживания повышенного пути) с кадастровым номером 325076200001000001 площадью 1,6246 га.* – Вагончик полевой, заводской инв. №10004, 1989 года выпуска. – Здание контейнерного типа «Лесник», заводской инв. №10017, 1990 года выпуска. – Здание контейнерного типа «Лесник», заводской инв. №10018, 1990 года выпуска. – Емкость 60 куб. м, заводской инв. №50084, 1989 года выпуска. – Виброразгрузчик, заводской инв. №50060, 1990 года выпуска. – Весы ВА-2019, заводской инв. №50058, 1991 года выпуска. – Трансформатор ТД-317, заводской инв. №50001, 1990 года выпуска. – Трансформатор силовой ТМ-1000, заводской инв. №40008, 1991 года выпуска. – Камера КСО, заводской инв. №40009, 1991 года выпуска. *Объекты лота №1 расположены по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, Сосновоборский поссовет с/с, юго-западнее 0,3 км ст. Жердь* | 91 308,91 | 9 130,89 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 22 сентября 2017 г.** в рабочие дни **с 9.00 до 16.00** от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время, место проведения аукциона | **25 сентября 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 13.09.2017 г. |
| Условия продажи | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов — 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость объекта, сформированную на аукционе, в течение 6 месяцев равными долями с момента подписания договора купли-продажи. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.05.2017 г. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 28 сентября 2017 года в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20 открытого повторного аукциона по продаже выявленного, задержанного, арестованного и обращенного в доход государства имущества

| № лота | Наименование объекта | Уполномоченный орган | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. №350/С-83927, площадью 787,3 кв. м**, назначение — здание специализированное внутреннего водного транспорта, наименование — **береговой производственный участок**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Подгорная, д. 10.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000001003845** общей площадью **0,4657 га (право постоянного пользования)**. Ограничение (обременение): **залог недвижимого имущества (ипотека), аренда.** | ИМНС РБ по Центральному р-ну г. Гомеля | 301 320,00 | 30 132,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. №350/С-70579, площадью 1 059,5 кв. м**, назначение — здание многофункциональное, наименование — **здание склада с мастерскими**. Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером с **340100000002000691** общей площадью **0,6002 га (право постоянного пользования).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1Г.** Ограничение (обременение): **ипотека.** | | 176 256,00 | 17 625,60 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. №350/С-168154, площадью 479,9 кв. м**, назначение — здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование — **склад**. Местонахождение: г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г. | | 107 856,00 | 10 785,60 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. №350/С-70577, площадью 1 504,7 кв. м**, назначение — здание административно-хозяйственное, наименование — **административное здание СУ-43**. Местонахождение: г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г. | | 436 392,00 | 43 639,20 |
| 5 | **Капитальное строение с инв. №350/С-168157, площадью 486,6 кв. м**, назначение — здание многофункциональное, наименование — **столярная мастерская с гаражами и складом**. Местонахождение: г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г. | | 111 600,00 | 11 160,00 |
| 6 | **Капитальное строение с инв. №350/С-168156, площадью 154,3 кв. м**, назначение — здание многофункциональное, наименование — **здание гаражей и склада**. Местонахождение: г. Гомель, ул. Лепешинского, д. 1г. | | 36 288,00 | 3 628,80 |
| 7 | Здание специализированное автомобильного транспорта **— гараж площадью 38,6 кв. м.** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская, 47Б/13, блок №112.** | ОПИ Центрального р-на г. Гомеля | 7 488,00 | 748,80 |
| 8 | **Капитальное строение с инв. №310/С-41690, площадью 2 455,6 кв. м**, назначение — здание специализированное животноводства, наименование — **здание коровника и телятника**. Местонахождение: **Гомельский р-н, Грабовский с/с, д. Журавлевка, ул. Полевая, 40/6.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **321081602101000026** общей площадью **6,0141 га (право постоянного пользования)**. | ИМНС по Гомельскому р-ну | 114 660,00 | 11 466,00 |
| 9 | **Капитальное строение с инв. №340/С-30011, площадью 745,2 кв. м**, назначение — сооружение неустановленного назначения, наименование — **навес №2**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **324550100001010218** общей площадью **0,1701 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1).** Местонахождение: **г. Речица, ул. Энергетиков, д. 1.** Ограничение (обременение): **ипотека.** | ИМНС РБ по Речицкому р-ну | 66 787,20 | 6 678,72 |
| 10 | **Изолированное помещение с инв. №340/D-219519, площадью 36,0 кв. м**, назначение — помещение неустановленного назначения, наименование — **гостиничный номер**. Адрес: **г. Речица, ул. Строителей, д. 4, пом №11.** | | 21 168,00 | 2 116,80 |
| 11 | **Капитальное строение с инв. №310/С-48027, площадью 44,3 кв. м**, назначение — здание одноквартирного жилого дома, наименование — **жилой дом**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **321085602101000319** общей площадью **0,1500 га (право пожизненного наследуемого владения).** Местонахождение: **Гомельская обл., Гомельский р-н, Прибытковский с/с, д. Климовка, ул. 1-я Совхозная, 156.** | ОПИ Гомельского р-на | 7 920,00 | 792,00 |
| 12 | **Капитальное строение с инв. №310/С-10738, площадью 33,1 кв. м**, назначение — здание одноквартирного жилого дома , наименование — **жилой дом**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **321087602101000032** общей площадью **0,0912 га**. Местонахождение: **Гомельский р-н, Терюхский с/с, д. Дикаловка, 91.** | | 5 812,56 | 581,26 |
| 13 | **Капитальное строение с инв. №350/С-171919, площадью 21,9 кв. м**, назначение — здание специализированное автомобильного транспорта, наименование — **кирпичный гараж (№40 с подвалом), ГСПК - 19.** Материал стен — кирпич. Год постройки — 1989г. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Иногородняя 3-я, 67/40.** | ОПИ Железнодорожного р-на г. Гомеля | 5 180,00 | 518,00 |
| 14 | **Капитальное строение с инв. №350/С-15758, площадью 22,5 кв. м**, назначение — здание специализированное автомобильного транспорта, наименование — **здание гаража №146, ГСПК - 32.** Местонахождение: г. Гомель, ул. Героев Подпольщиков, ГСПК — 32. | | 6 980,91 | 698,10 |
| 15 | **Капитальное строение с инв. №350/С-76922, площадью 16,4 кв. м,** назначение — здание специализированное автомобильного транспорта, наименование — **здание гаража №37, ГСК — 4, блок 7.** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, 116/Б.** | | 998,15 | 99,82 |
| 16 | **Капитальное строение с инв. №350/С-62116, площадью 17,1 кв. м**, назначение — здание специализированное автомобильного транспорта, наименование — **гараж №371**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Лепешинского, ГСК - 6.** | | 2 240,00 | 224,00 |
| 17 | **Капитальное строение с инв. №300/С-2470, площадью 165,2 кв. м**, назначение — здание специализированное розничной торговли, наименование — **здание магазина**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000001000009** общей площадью **0,0924 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Подгорная, д.10.** Ограничение (обременение): **ипотека.** | ИМНС РБ по Минскому р-ну | 104 889,60 | 10 488,96 |
| 18 | **Изолированное помещение с инв. №330/D-203, площадью 156,0 кв. м,** назначение — помещение общественного питания, наименование — **помещение бара**. Местонахождение: **г. Мозырь, ул. Пушкина, д. 33.** | ОПИ Мозырского р-на | 74 088,00 | 7 408,80 |
| 19 | **Изолированное помещение с инв. №330/D-4248, площадью 56,5 кв. м**, назначение — квартира №2, наименование — **трехкомнатная квартира**. Местонахождение: **г. Мозырь, ул. Якуба Колоса, д. 5, кв. 2.** | | 75 297,60 | 7 529,76 |
| 20 | **Капитальное строение с инв. №330/С-20101, площадью 554,0 кв. м**, назначение — здание многоквартирного жилого дома, наименование — **двухэтажное кирпичное здание**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **341500000010000076** общей площадью **0,2704 га**. Местонахождение: **г. Мозырь, ул. Портовая, д. 16.** | | 24 713,64 | 2 471,36 |
| 21 | **Капитальное строение с инв. №330/С-2869, площадью 131,0 кв. м,** назначение — здание одноэтажное кирпичное магазина, наименование — **одноэтажное кирпичное магазина**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **341500000006000025** общей площадью **0,0378 га**. Местонахождение: **г. Мозырь, ул. Пролетарская, д. 36А.** | | 47 174,40 | 4 717,44 |
| 22 | **Капитальное строение с инв. №330/С-6353, площадью 2552,5 кв. м**, назначение — здание нежилое, наименование — **здание цеха №1**. Год постройки — 1969 г. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **341500000015000046** общей площадью **0,2155 га.** Местонахождение: **Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Гагарина, д. 85Г.** | | 569 772,00 | 56 977,20 |
| 23 | **Строительные материалы**, вложенные в строительство деревянного дома по адресу: **Мозырский р-н, Махновичский с/с, д. Зеленый Мох, ул. Луговая, д. 8**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **323582003601000001** общей площадью **0,1000 га**. | | 2 111,20 | 211,12 |
| 24 | **Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, площадью 396,0 кв. м** Местонахождение: **Мозырский р-н, Козенский с/с, д. Наровчизна, ул. Южная,13.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **323581203601000456** общей площадью **0,0963 га**. | | 12 600,00 | 1 260,00 |
| 25 | **Капитальное строение с инв. №335/С-6190, площадью 396,0 кв. м**, назначение — здание кирпичного гаража, наименование — **кирпичный гараж**. Местонахождение: **Петриковский р-н, Муляровский с/с, п. Муляровка.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **32438640561000106** общей площадью **12,3119 га**. | ИМНС РБ по Петриковскому р-ну | 24 792,00 | 2 479,20 |
| 26 | **Капитальное строение с инв. №335/С-7843, площадью 818,5 кв. м,** назначение — здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование — **пункт технического обслуживания**. **Адрес:** Петриковский р-н, Муляровский с/с, п. Муляровка, ул. Рабочая, д. 41, корп. 1. **Информация о земельном участке**: расположен на земельном участке с кадастровым номером **324386405600000009** общей площадью **11,8732 га. Местонахождение:** Петриковский р-н, Муляровский с/с, п. Муляровка (производственная база). Ограничение (обременение): **ипотека.** | | 125 100,00 | 12 510,00 |
| 27 | Единый объект недвижимого имущества в составе: **капитальное строение с инв. № 335/С-4843,** назначение — здание гостинец, мотелей, кемпингов, наименование — **агротуристический комплекс «Матчына хата»**. Составные части и принадлежности: Мини кафе «Харчевня», пристройка, терраса, жилой дом №1, пристройка, жилой дом №2, пристройка, терраса, жилой дом №3, пристройка, терраса, мансарда, баня, терраса, склад, сеновал, беседка, сарай, уборная. Местонахождение: **Петриковский р-н, Копаткевичский поселковый Совет с/с, д. Ивашковичи, ул. Центральная, 2.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **324376002101000026** общей площадью **0,8285 га (право постоянного пользования)**. | | 135 300,00 | 13 530,00 |
| 28 | **Капитальное строение с инв. №335/С-50137, площадью 340,5 кв. м**, назначение — здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование — **мастерские**. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **324300000001001362** общей площадью **87,7923 га.** Местонахождение: **Петриковский р-н, Лучицкий с/с, д. 9/1, здание мастерских.** | | 32 400,00 | 3 240,00 |
| 29 | **Капитальное строение с инв. №330/С-6152, площадью 2 964,0 кв. м**, назначение — здание котельной, наименование — **5 (пяти)-этажное кирпичное нежилое здание котельной**. Информация о земельном участке: объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **323550100008001562** общей площадью **1,9969 га (право аренды, доля в праве 1/3).** Местонахождение: **г. Мозырь, ул. Социалистическая, д. 120.** | ИМНС РБ по Мозырскому р-ну | 188 448,00 | 18 844,80 |
| 30 | **Изолированное помещение с инв. №331/D-11303, площадью 441,4 кв. м**, назначение — административное помещение, наименование — **административное помещение**. Адрес: **г. Ельск, ул. 50 лет СССР, д. 16-1.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **321450100004001035** общей площадью **0,1945 га (право постоянного пользования)**. Местонахождение: **Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. 50 лет СССР, д. 16.** | | 163 620,00 | 16 362,00 |
| 31 | **Капитальное строение с инв. №330/С-15779, площадью 763,0 кв. м**, назначение — здание административно-хозяйственное, наименование — **двухэтажное кирпичное здание производственной базы**. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **323550100012000019** общей площадью **0,5835 га (право аренды).** Местонахождение: **Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Иваненко, 17** | | 249 120,00 | 24 912,00 |
| 32 | **Капитальное строение с инв. №334/С-8920, площадью 1 311,1 кв. м**, назначение — здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование — **здание пункта ТО ТР(пункт технического обслуживания и текущего ремонта)**. Местонахождение: **г. п. Лельчицы, ул. Советская, д. 82Л.** Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером **322855100002001697** общей площадью **0,5030 га**. Ограничение(обременение): **ипотека.** | ИМНС РБ по Лельчицкому р-ну | 127 234,80 | 12 723,48 |
| 33 | **Капитальное строение с инв. №340/С-306963, площадью 496,0 кв. м,** назначение — здание специализированное иного назначения, наименование — **навес №2**. **Адрес: г.п. Лоев, ул. Ленина, д. 54Б, корп. 1. Информация о земельном участке**: расположен на земельном участке с кадастровым номером **323055100001002616** общей площадью **3,0059 га. Местонахождение:** г. п. Лоев, ул. Ленина, д. 84. | ИМНС РБ по Лоевскому р-ну | 30 168,00 | 3 016,80 |
| 34 | **Капитальное строение с инв. №340/С-306964, площадью 492,8 кв. м,** назначение — здание специализированное иного назначения, наименование — **навес на 7 комбайнов**. **Адрес: г.п. Лоев, ул. Ленина, д. 54Б, корп. 2. Информация о земельном участке**: расположен на земельном участке с кадастровым номером **323055100001002616** общей площадью **3,0059 га. Местонахождение:** г.п. Лоев, ул. Ленина, д. 84. | | 29 952,00 | 2 995,20 |
| 35 | **Капитальное строение с инв. №340/С-306509, площадью 487,1 кв. м,** назначение — здание административно-хозяйственное, наименование — **административное здание**. **Информация о земельном участке**: расположен на земельном участке с кадастровым номером **323055100001002615** общей площадью **0,1781 га. Местонахождение:** г.п. Лоев, ул. Ленина, д. 84. | | 136 800,00 | 13 680,00 |
| 36 | **Капитальное строение с инв. №333/С-78626, площадью 61,2 кв. м**, назначение — здание специализированное иного назначения, наименование — **здание КПП**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **322381801101000228** общей площадью **0,0464 га.** Местонахождение: **Калинковичский р-н, Дудичский с/с, аг. Дудичи, ул. Юбилейная, д.7.** | ИМНС РБ по Калинковичскому району | 23 440,00 | 2 344,00 |
| 37 | **Капитальное строение с инв. №323/С-5935, площадью 67,4 кв. м,** назначение — **здание одноквартирного жилого дома.** Год постройки - **1958г.** Местонахождение: **Кормянский р-н, Коротьковский с/с, д. Сырск, ул. Крестьянская, д.88** (г.п. Корма, ул. Крестьянская, д. 88). | ОПИ Кормянского р-на | 6 940,08 | 694,01 |
| 38 | **Капитальное строение с инв. №320/С-6084, площадью 78,4 кв. м**, назначение — садовый, дачный домик (дача), наименование — **одноэтажный бревенчатый садовый домик, облицованный кирпичом, с мансардой, верандой**. Информация о земельном участке: кадастровый номер **321883200005000196** общей площадью **0,0750 га (право собственности — частная)**. Местонахождение: **Жлобинский р-н, Кировский с/с, СТ «Жлобинский Сейбит», д. 104.** | ОПИ Жлобинского р-на | 15 989,40 | 1 598,94 |
